ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 33 (1100) | Субота, 11 жніўня 1956 года | Цана 40 кап.

ЗАЎТРА — УСЕСАЮЗНЫ ДЗЕНЬ БУДАЎНІКА

ПРА ТЫХ, ХТО БУДУЕ

Пра людзей гэтай прафесіі пісаць цяжка: магчыма, таму, што пра іх сказана ўжо нямала добрага, ці таму, што не заўсёды знойдзеш словы, якімі можна было-б найбольш ярка расказаць аб высакароднай працы будаўнікоў.

...З Антонам Вікенцевічам Шчарбовічам — брыгадзірам цесляроў першага будаўнічамантажнага ўпраўлення трэста № 3—мы пазнаёміліся на аб'екце. З вышыні васьмінавяховага 123-кватэрнага жылога будынка, які ўзняўся побач з акруговым Домам афіцэраў у Мінску, горад, як на далоні. Налева, паступова звужваючыся,—шырокая гладзь асфальта цэнтральнай магістралі губляецца сярод высокіх светлых дамоў; справа яна ўпіраецца ў абеліск Перамогі і, агінаючы яго па абодвух баках, зноў імкліва вырываецца наперад і імчыць да самай Маскоўскай шашы. А як шырока раскінуўся горад у процілеглых напрамках! Забудавалася і перастала быць далёкай украінай няўтульная ў мінулым Старажоўка, на многія кілометры пасунулася наперад гарадская мяжа ў раёне трактарнага і аўтамабільнага заводаў.

— Цудоўна ўсё гэта, — з захапленнем гаворыць Антон Вікенцевіч. — Веру я, што здродзім Мінск, зробім яго лепшым, але, прызнацца па праўдзе, такога не чакаў...

Уважліва агледзеўшы наваколле яшчэ раз, ён заключае сваю думку:

— Размаху такога не чакаў.

Захацелася задаць некалькі пытанняў брыгадзіру. Антон Вікенцевіч адказвае на іх коратка:

— Калі пачаў цяслярыць? У 1944 годзе, на другі месяц, як прагналі фашыстаў з Мінска. Што будаваў? Многа: гасцініцу «Беларусь», дзве сярэднія школы, жылыя дамы на праспекце, дзіцячыя яслі — усяго не прыгадаеш. На вачах вырастаў горад, а да слова сказаць, і сам рос разам з ім: пачынаў радавым цесляром, а цяпер брыгадзір, майстар вышэйшага разраду.

Размова заходзіць пра тэхніку. Антон Вікенцевіч садзіцца на бэлькі перакрыцця, не спяшаючыся гаворыць:

— Прыкладамі раскажу пра нашу тэхніку. Вось, скажам, дах на такім доме раней дванаццаць чалавек маглі паставіць толькі за месяц. Цяпер пяцярым за тыдзень рабіць няма чаго. Чаму? Кроквы, цэгла, раствор раней на сабе наверх дастаўлялі, а ў лепшым выпадку маламагутнымі пад'ёмнікамі. Цяпер вежавыя краны працуюць. А зборныя жалезабетонныя дэталі вазьміце — гэта-ж выдатная рэч. Два цесляры цяпер за змену ўкладваюць па 5—6 лесвічных маршаў. Прыкіньце, колькі часу трацілася на гэта раней, калі будоўлі не забяспечваліся такімі гатовымі дэталямі? Тэхніка здорава ўгору пайшла — гэта факт.

— Многа ўсякіх матэрыялаў выдаткоўваецца на будаўніцтва: метал, цэмент, мармур, а я ўсё-ж больш дрэва люблю...

Дрэва! — вочы Шчарбовіча цяплеюць, калі ён гаворыць гэтае слова. — Без яго, брат, і ў Лужніках не абыйшліся.

Антон Вікенцевіч на хвіліну змаўкае, а мне ўяўляецца, што гэтак-жа пяшчотна і цёпла думае педагог пра свайго выдатнага вучня; гэтак-жа любоўна занатоўвае пісьменнік у запісную кніжку дэталь, якую доўга шукаў для свайго будучага твора; старанна кідае сейбіт у глебу насенне, упэўнены, што ні адно зерне не прападзе ў ёй дарэмна.

З далейшай размовы высвятляецца адна нечаканая акалічнасць: аказваецца, брыгадзір Шчарбовіч знаходзіцца ў гэтую мінуту зусім не на сваім аб'екце.

— Мая будоўля побач,—смяецца ён. — Таксама жылы дом узводзім. Нядаўна пачалі: па першы паверх яшчэ толькі выйшаў наш дом. А сюды я да таварыша на хвіліну заглянуў — справамі зацікавіцца. Знаёмцеся, калі ласка, гэта Чайко. Мы з ім спаборнічаем.

Знаёмімся з брыгадзірам Чайко. Ён гадоў на пятнаццаць малодшы за Шчарбовіча, ды і стаж вытворчы ў яго напалавіну меншы. Ня будаўніцтва Чайко прыйшоў пяць гадоў назад і за гэты час зарэкамендаваў сябе з самага лепшага боку. У цяслярскай брыгадзе комуніста Чайко 11 чалавек і кожны з іх штодзённа дае па 170—180 працэнтаў нормы. Сам брыгадзір перакрывае заданне ўдвая.

Уладзімір Чайко — адзін з тых, хто пераймае багаты вопыт ветэранаў-будаўнікоў, уносячы ў яго сваю творчасць, складае армію дастойных паслядоўнікаў, знатных горада-будаўнікоў.

— З розумам хлопец, — гаворыць пра яго Антон Вікенцевіч. — Не канструктар, не інжынер, а даходзіць да такіх рэчаў, што іншай вучонай галаве не дадумацца. Вось, напрыклад, што ён з гіпсавымі блокамі прыдумаў. Прымяняюцца яны для ўнутраных перагародак. Формы гэтыя раней мы нарыхтоўвалі ўручную, а Чайко прапанаваў адліваць іх на стэндах. На практыцы атрымалася выдатна: выйгралі час, намнога ўзнялі прадукцыйнасць працы. Цяпер гэтая прапанова трывала ўкараняецца на многіх іншых будоўлях.

Нас, натуральна, зацікавіла пытанне: хто трымае першынство ў спаборніцтве брыгад? Малады жыццерадасны Чайко жартуе:

— Мне з такой вышыні добра відаць поспехі Антона Вікенцевіча. Ён дае па 150 працэнтаў нормы, і я стараюся не адстаць.

— А ў мяне вымяральнік іншы, — тлумачыць Шчарбовіч. — Па зарплаце. Рубель у рубель ідзем з Чайко. Распісваемся ў ведамасці за тысячу рублёў кожны, значыць не адстаем адзін ад аднаго. Прафесіі ў нас аднолькавыя, расцэнкі таксама — вось і вымяральнік па заробку.

Чайко ўважліва ўглядаецца ў панараму раскінутага ўнізе горада і, нібы звяртаючыся да нас, гаворыць:

— Нямігу вось добра было-б перабудаваць, пашырыць, занава паставіць на ёй добрыя дамы. Рукі свярбяць па такой справе. А ўжо хутка дабярэмся і да Нямігі.

Г. МАР'ЯСАЎ.

На здымку: А. Шчарбовіч (злева) і **У. Чайко.**

Госці Мінска

Пан Трапата — бельгіец. У Бруселі ў яго ёсць невялікі кінотэатр. Сабраўшы сродкі, пан Трапата вырашыў адправіцца ў падарожжа. Але паехаў ён не ў Амерыку, што пастаўляе фільмы яго кінотэатру, а ў Совецкі Саюз.

Першым буйным горадам, дзе спыніўся Трапата, быў Мінск. Госць пазнаёміўся з горадам. Наведаў адзін з калгасаў, аўтамабільны завод і, глыбока ўсхваляваны ўбачаным, заявіў, што на ўсё жыццё запомніў сталіцу Беларусі...

Такія госці ў Мінск прыязджаюць усё часцей і часцей. З таго часу, як тут было арганізавана аддзяленне «Інтурыст», горад наведала больш 400 падарожнікаў і турыстаў. Гасцямі Мінска былі людзі з розных краін — журналісты Францыі і Індыі, служачыя Германскай Федэральнай Рэспублікі, прамыслоўцы Англіі.

Асабліва ўзрасла цікавасць да жыцця працоўных Беларусі ў амерыканскіх падарожнікаў. Тут пабывалі фабрыкант Гофман, літаратар Шоскес, кравец Хохстэйн, лектар і падарожніца Юніс Гарыет Эверы. Усе яны яшчэ раз пераканаліся ў мірных імкненнях совецкіх людзей, з вялікай цікавасцю агледзелі адноўлены за кароткі час горад. Гарыет Эверы пакінула ў кнізе водгукаў наступны запіс: «Вельмі рада, што наведала Мінск. У соўгасе, піонерскім лагеры, на цукеркавай фабрыцы і ў велічных вуліцах і будынках я бачу яго будучыню. Жадаю Мінску і яго насельніцтву ўсяго найлепшага заўсёды і ва ўсім».

«Я пакідаю Мінск з добрым пачуццём», — піша амерыканец Гофман.

Днямі гасцямі Мінска была вялікая група падарожнікаў з Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі. Яны агледзелі горад, пабывалі ў музеі Вялікай Айчыннай вайны, на буйнейшых прадпрыемствах.

Спектаклі Беларускага тэатра ў Одэсе

Другі раз за апошнія тры гады наведаў Одэсу калектыў драматычнага тэатра імя Я. Коласа. Цёпла сустрэў адэскі глядач першы спектакль коласаўцаў — «Крэпасць над Бугам» С. Смірнова.

На працягу месяца тэатр пакажа дзесяць спектакляў. Сярод іх «На крутым павароце» К. Губарэвіча, «Машэка» В. Вольскага, «Шчасце» І. Дорскага, «Капітан Коршун» В. Сабко і інш.

За час гастролей тэатр правядзе некалькі творчых сустрэч з рабочымі прадпрыемстваў горада і калгаснікамі вобласці.

Б. РАКІЦІН.

Одэса.

За творчае развіццё крытыкі і літаратуразнаўства

У сувязі з асуджэннем культу асобы, які прыводзіў у літаратуры да лакіроўкі жыцця, да занядбання рэальных канфліктаў і сцярэчнасцей і спрыяў з'яўленню твораў ілюстрацыйных і павярхоўных, пісьменнікі сталі бліжэй да жыцця народа, да працы, быту духоўных занатрабаванняў вялікага героя нашай літаратуры — простага совецкага чалавека.

Зразумела, было-б няправільна перацэньваць усе мастацкія каштоўнасці, шукаць слядоў культу асобы нават там, дзе яго не было і не магло быць. У мастацкай скарбніцы многанацыянальных совецкіх літаратур многа твораў, якія ў высокамастацкіх вобразах узнаўляюць гісторыю ўзнікнення, станаўлення і росту Совецкай дзяржавы, малююць жыццёва ўсёй яго складанасці. Наш народ ганарыцца гэтымі творамі і па праву лічыць іх узорамі совецкай класікі.

З другога боку, было-б няправільна не бачыць, як нашкодзілі нашаму літаратуразнаўству дагматызм, схаластыка і начытніцтва. У беларускім літаратуразнаўстве з гадамі накапілася многа фактаў, якія або не прымаліся пад увагу, або падганяліся пад загадзя прыдуманую схему. Так літаратурны працэс паступова спрашчаўся і ў многіх выпадках рабіўся мала падобным на той, якім быў на самай справе.

Калі мы і раней гаварылі, што наша літаратуразнаўства не дало адказу на многія нявысветленыя або спрэчныя пытанні гісторыі беларускай літаратуры, крытыкавалі яго за недастатковую ўвагу да першакрыніц, дык цяпер гэтыя недахопы сталі асабліва відавочнымі.

Кожнаму павінна быць зразумелым, што без пераадолення гэтых недахопаў нельга стварыць сапраўды навуковую гісторыю беларускай літаратуры. Мы часта паўтараем агульнавядомую ісціну аб тым, што гісторыю нельга ні паляпшаць, ні пагаршаць, а на самай справе нават курс вышэйшай школы дае студэнтам збедненае ўяўленне пра асобныя перыяды беларускай совецкай літаратуры.

Інтарэсы павышэння тэарэтычнага ўзроўню літаратуразнаўства настойліва патрабуюць разабрацца ў існуючай сістэме падрыхтоўкі навуковых кадраў. Калі пералічыць тэмы дысертацый, за якія ў апошнія гады прысвоена годнасць кандыдата філалагічных навук, дык атрымаецца даволі вялікі і цікавы спіс. Тут даследаванні творчасці Я. Купалы, Я. Коласа, К. Крапівы, М. Танка, Эд. Самуйлёнка. Многія з дысертацый прысвечаны важным тэарэтычным праблемам, такім, напрыклад, як праблема канфлікту ў драматургічных творах, мова і стыль асобных пісьменнікаў і г. д. Калі-б кожная з гэтых дысертацый была арыгінальным даследаваннем і вырашала на належным тэарэтычным узроўні закранутыя ў ёй праблемы, дык наша літаратуразнаўства мела-б значныя здабыткі.

Не будзе перабольшаннем, калі сказаць, што рэальнае значэнне многіх дысертацый для нашай літаратурнай навукі роўна нулю. Адзінымі чытачамі іх бываюць самі дысертанты і іх апаненты. Далейшы лёс гэтых навуковых даследаванняў, на якія затрачаны немалыя дзяржаўныя грошы, — ляжаць на паліцах кнігасховішчаў і пакрываюцца пылам. Спробы надрукаваць іх часцей за ўсё канчаюцца няўдачай, бо яны не вытрымліваюць самых элементарных патрабаванняў, якія прад'яўляюцца да навуковай працы.

Важным сродкам у справе актывізацыі навуковай думкі пры высвятленні спрэчных і недаследаваных пытанняў з'яўляюцца дыскусіі і творчыя абмеркаванні. Вялікую ролю тут мог-бы адыграць Інстытут літаратуры і мастацтва Акадэміі навук БССР. Там працуе значны калектыў вучоных, якія непасрэдна займаюцца распрацоўкай праблем беларускай літаратуры. У свой час у Інстытуце адбылася дыскусія па эстэтыцы совецкай літаратуры ў сувязі з абмеркаваннем кнігі праф. І. Гутарава. Дыскусія прыцягнула ўвагу шырокай навуковай грамадскасці і прынесла відавочную карысць. Аднак гэта было вельмі даўно. А чаму-б не ўзяць Інстытуту разам з Саюзам пісьменнікаў рэспублікі за звычай штогодняе абмеркаванне вынікаў літаратурнага года з пастаноўкай дакладаў па прозе, паэзіі, драматургіі, крытыцы.

Ёсць многа нераспрацаваных пытанняў эстэтыкі, гісторыі і тэорыі літаратуры. Узяць хоць-бы пытанне перыядызацыі гісторыі беларускай літаратуры або высвятленне ролі і творчага аблічча літаратурных арганізацый «Маладняк», «Полымя», «Узвышша» і інш., пра якія ў нас няма аўтарытэтных і грунтоўных прац. Ды і асвятленне газеты «Наша ніва» ў курсе гісторыі літаратуры вельмі павярхоўнае. Ніхто з літаратуразнаўцаў не можа сказаць, што ён грунтоўна займаўся гэтым пытаннем. У нас ёсць прыхільнікі ацэнкі «Нашай нівы», якая дадзена ёй на старонках «Гісторыі БССР», ёсць і праціўнікі гэтай ацэнкі. Чаму-б Інстытуту літаратуры і мастацтва не арганізаваць творчую дыскусію, каб даць людзям магчымасць публічна выказацца па гэтаму пытанню. Дыскусіі, спрэчкі ва ўсеўзбраенні фактаў, пасля грунтоўнага вывучэння першакрыніц далі-б магчымасць прыйсці да агульных вывадаў.

Нашы літаратуразнаўцы павінны прыняць у свой адрас папрок, які звычайна выказваецца гісторыкам за тое, што яны недастаткова займаліся вывучэннем першакрыніц. У гэтай галіне перад Інстытутам літаратуры і мастацтва АН БССР непачаты край работы. Дастаткова сказаць, што ў нас няма поўных акадэмічных выданняў класікаў беларускай літаратуры. Нават улічваючы ўсю складанасць такіх выданняў, якім павінна папярэднічаць вялікая работа па выяўленню новых рукапісаў, па напісанню каментарыяў, па стварэнню летапісу жыцця і творчасці пісьменніка, трэба прызнаць, што падрыхтоўка выданняў ідзе вельмі марудна.

У рэспубліцы даўно наспела праблема стварэння спецыяльнага выдання, якое-б займалася публікацыяй літаратурнай спадчыны і даследаванняў выяўленых у архівах матэрыялаў. Гэта значна актывізавала-б архіўныя пошукі і спрыяла-б згуртаванню сіл гісторыкаў літаратуры.

Многа мог-бы зрабіць для разгортвання творчых дыскусій часопіс «Полымя», аднак ён абыходзіць вострыя праблемныя пытанні развіцця беларускай літаратуры. Многія яго матэрыялы маюць папулярызатарскі характар.

Папулярызатарскі характар, напрыклад, носіць артыкул Л. Арабей пра Цёткі, як быццам творчасць паэтэсы так усебакова даследавана, што тут літаратуразнаўцу няма чаго сказаць свайго, няма з чым паспрачацца. Праўда, у адным месцы свайго артыкула Л. Арабей спрабуе завязаць палеміку і аспрэчвае няправільны погляд, нібы прыняты беларускім літаратуразнаўствам, быццам апавяданні Цёткі, напісаныя ў 1911—1912 гг.: «Асеннія лісты», «Лішняя», «Зялёнка», азначаюць здраду паэтэсы сваім рэвалюцыйна-дэмакратычным ідэалам. Аднак дастаткова зазірнуць у працы пра творчасць Цёткі, каб пераканацца, што Л. Арабей ваюе з уяўным праціўнікам: прыніжае беларускаму літаратуразнаўству погляды, якіх яно не прытрымліваецца, і затым лёгка абвяргае іх. Было-б лепш і для часопіса і для чытачоў, калі-б даследчык замест таго, каб вырашаць уяўныя праблемы, сказаў пра творчасць паэтэсы новае слова.

За гэты год часопіс не надрукаваў ні аднаго артыкула дыскусійнага характару. А спрачацца ёсць аб чым. Аб гэтым сведчыць рэцэнзія Я. Усікава на манаграфію С. Майхровіча пра творчасць В. І. Дуніна-Марцінкевіча. Рэцэнзент палемізуе з асобнымі палажэннямі кнігі, крытыкуе С. Майхровіча за непаслядоўнасць яго канцэпцыі, гаворыць пра яго павярхоўны разгляд мастацкай формы драматычных твораў пісьменніка. Ёсць у рэцэнзіі і больш сур'ёзныя дакоры даследчыку. Я. Усікаў піша, што разважанні С. Майхровіча пра сентыменталізм Дуніна-Марцінкевіча «набываюць ледзь не схаластычны характар», рэцэнзент тлумачыць некаторыя недахопы кнігі «недастатковай кампетэнтнасцю аўтара ў пытаннях тэорыі літаратуры», кідае яму папрок за тое, што ён часам трапляе ў палон «фальшывай антынавуковай схемы», за тое, што ў даследаванні прыніжана паслярэформенная драматургія пісьменніка і г. д. Вось, здавалася-б, была падстава для рэцэнзента паспрачацца і давесці свае, правільныя погляды на творчасць Дуніна-Марцінкевіча. Але гэтага не здарылася: Я. Усікаў выказвае дакоры ў вельмі агульнай, безапеляцыйнай форме.

Часопіс недаравальна мала друкуе артыкулаў па пытаннях пісьменніцкага майстэрства. За апошнія сем месяцаў гэтай тэме быў прысвечаны толькі адзін артыкул — «Стыль і мова аповесці Якуба Коласа «Дрыгва» А. Налівайкі. Аднак цікавасць, выкліканая тэмай артыкула, знікае, як толькі пагдыбляешся ў яго чытанне.

Аўтар артыкула ідзе да разгляду стылявых і моўных асаблівасцей аповесці не ад таго пачуцця, якое выклікае сапраўды мастацкі твор, а ад загадзя выпрацаванай літаратуразнаўчай схемы. Ён ведае, што ў «Дрыгве» павінен быць унутраны маналог, перакрыжаваныя характарыстыкі, партрэты герояў і г. д. І ўстанаўліваe, што ўсё гэта там сапраўды ёсць. Але падобны аналіз не дапамагае даследчыку пранікнуць у ідэйна-мастацкую сутнасць вобраза. Мастацкая дасканаласць твора, жыццёвасць і складанасць чалавечых характараў, намаляваных у ім, застаюцца для яго за сямю замкамі.

У чытача не толькі не ствараецца больш глыбокае разуменне аповесці, як гэта бывае, калі прачытаеш сапраўднае навуковае даследаванне, а наадварот, узнікае крыўднае пачуццё, чаму крытык так сумна разважае пра цікавыя рачы. А Налівайка ўстанаўліваe, што погляды прадстаўнікоў розных класаў на Саўку Мільгуна супадаюць, а на Мартына Рыля, наадварот, разыходзяцца, што вочы дзеда Талаша мяняюцца ў залежнасці ад яго ўнутранага стану, што прыём перакрыжаваных характарыстык дае магчымасць пісьменніку «не толькі дасягаць надзвычайнай шматбаковасці, але часам у большай ступені ахарактарызаваць не ўспрыймаемага героя, а таго, хто і як успрыймае тую або іншую падзею». Чытачу даводзіцца праціірацца праз гушчар такіх навукападобных разважанняў, каб зразумець, што-ж хоча сказаць даследчык.

Прывёўшы некалькі нават не выразаў, а толькі слоў, вылушчаных з мастацкай тканіны аповесці, А. Налівайка робіць глыбокадумны вывад: «Гэтым паказам галоўнага героя то адным, то другім бокам аўтар дасягае надзвычайнай шматбаковасці ў характарыстыцы дзеда Талаша». Якія-ж гэта словы? Вось яны: «чалавек замыслы, хітры, асцярожны, але рашучы і смелы і чалавек паважны», «стары друг»; «стары прыяцель»; «слаўны дзед»; «чалавек патрэбны і цэнны». Наўрад ці трэба даваць якія-небудзь каментарыі да падобнага аналізу мастацкага характару.

Або якую важную ісціну хацеў паведаміць крытык, калі падлічыў, што «метафар у аповесці менш у параўнанні з усімі іншымі вобразнымі сродкамі»? Ўявіце сабе літаратуразнаўца, які на адным лічыльніку адкладвае метафары, а на другім — словы, ужытыя ў простым значэнні, і прыходзіць у выніку такой нялёгкай працы да вываду, які нічога не гаворыць ні розуму, ні сэрцу. Сумны малюнак!

А вось як А. Налівайка аналізуе пейзаж «Дрыгвы». Для яго вясна, напрыклад, — гэта не малюнак пары года, створаны сродкамі мастацкага слова; а «узмацніцель бадзёрага» настрою, «характар сімвала, у якім заключаны глыбокі палітычны сэнс». Імкненне адшукаць за кожным пейзажным малюнкам нейкі таемны сэнс, палітычны падтэкст так заваладала крытыкам, што, напрыклад, малюнак спакойнай Прыпяці, на яго думку, трэба разглядаць не інакш, як толькі сімвал застою, коснасці жыцця дарэволюцыйнага Палесся, а Прыпяць, якая разбушавалася, павінна толькі сімвалізаваць абуджэнне людзей Палесся «пад уплывам рэвалюцыйных падзей».

Ёсць у артыкуле і больш сенсацыйныя адкрыцці. Аказваецца, што Я. Колас пісаў «Дрыгву», схаваўшыся за нейкае другое імя. А. Налівайка так і гаворыць: «Апавяданне вядзецца ад імя трэцяй асобы, відаць, селяніна — чалавека бывалага, які добра разумее абставіны таго часу, аб якіх ідзе гаворка ў творы. Ён імкнецца да найбольш поўнай і жыццёва правільнай перадачы падзей, пасобных эпізодаў, размоў паміж тымі або іншымі людзьмі». Так ва ўсіх на вачах робіцца цуда: у аповесці «Дрыгва» выяўляецца яшчэ адзін персанаж. Больш таго, А. Налівайка нават дае яму характарыстыку.

Матэрыялы, падобныя артыкулу А. Налівайкі, ніяк не ўпрыгожваюць старонкі «Полымя» і сведчаць пра яго невысокую патрабавальнасць да літаратуразнаўчых прац, якія друкуюцца ў часопісе.

Не вызначаецца творчым падыходам да закранутай праблемы і артыкул Ф. Бондаравай «Нявырашаная творчая задача». Гутарка ідзе аб стварэнні беларускімі літаратарамі кіносцэнарыяў. Аўтар артыкула ў ацэнцы асобных твораў гэтага важнага жанра мастацкай літаратуры паказала сваю непатрабавальнасць і не вельмі высокі мастацкі густ. Дарэмна часопіс паспяшаўся далучыцца да той ацэнкі, якую дала Ф. Бондарава сцэнарыю А. Маўзона «Зялёныя агні»: «...ў цэлым сцэнарый дазваляе чакаць, што на аснове яго атрымаецца нядрэнны мастацкі фільм». Гэта было надрукавана ў студзеньскім нумары, а прыблізна праз месяц пасля выхаду часопіса на экранах паявіўся фільм, і друк у адзін голас загаварыў пра яго як пра твор, які спрашчае жыццё, паказвае яго схематычна і збеднена. Між іншым, пры больш прынцыповым стаўленні да закранутай у артыкуле праблемы рэдакцыя часопіса магла-б заўважыць усё гэта яшчэ да выхаду фільма: сцэнарый «Зялёныя агні» быў надрукаваны ў альманаху «Советская Отчизна».

Гэтак-жа беспадстаўна Ф. Бондарава ўзялася хваліць сцэнарый А. Гінцбурга «Высокі пост», які нібы «выводзіць праўдзівыя вобразы совецкіх людзей», «узнімае рад важных праблем» і з'яўляецца заяўкай на «сур'ёзны драматургічны твор». Праўда, усе гэтыя пахвалы рассыпаны паміж крытычных заўваг па сцэнарыю, але як можна гаварыць аб вобразах твора, які раскрытыкаваны ў друку за мастацкую бездапаможнасць.

У арсенале літаратурнай крытыкі ёсць такі выраз: пафас паэта. Было-б вельмі добра, каб і крытыкі пісалі пра нашу паэзію з большым пафасам, чым гэта часта здараецца. У другім нумары «Полымя» надрукавана рэцэнзія М. Барсток на зборнік вершаў К. Кірэенкі «Любоў і дружба». У рэцэнзіі добрыя і слабыя вершы разглядаюцца так непаслядоўна, што цяжка гаварыць аб яе якой-небудзь кампазіцыі. Дзіўна гучыць і вывад у канцы рэцэнзіі: «К. Кірэенка можа пісаць добрыя творы». Як быццам папярэднія зборнікі гэтага не пацвярджалі.

Трэба сказаць, што матэрыялы аддзелаў крытыкі і бібліяграфіі займаюць у часопісе «Полымя» недастатковае месца. Часопіс часта яшчэ задавальняецца слабымі артыкуламі і рэцэнзіямі. І пра мову і стыль такога майстра літаратуры, як Я. Колас, і пра творчасць Цёткі, і пра сённяшнюю нашу прозу, паэзію і драматургію можна пісаць свежа і цікава. Наша літаратура дасягнула такога ўзроўню, што па яе творах можна ставіць і вырашаць праблемы, якія маюць значэнне для ўсёй совецкай літаратуры.

Літаратура — народнае багацце. Беражліва сабраць і вывучыць усё каштоўнае, што дала яна ў мінулым, дапамагаць, каб яна ва ўсёй паўнаце паказвала сённяшняе жыццё совецкіх людзей, іх працу на будаўніцтву комунізма — такая найпершая задача крытыкі і літаратуразнаўства.

Р. ШКРАБА.

ПА РЭСПУБЛІЦЫ

* *

Беларускі фаянс і фарфор

У многіх магазінах нашай рэспублікі, Украіны і Літвы можна набыць выробленыя з фарфору статуэткі «Маленькая гаспадыня», «Малахітавая шкатулка», «Арлы» і рад іншых. Статуэткі карыстаюцца вялікім попытам у пакупнікоў. І гэта зразумела. Яны зграбныя, маюць добрае мастацкае аздабленне. Асабліва арыгінальная «Малахітавая шкатулка», зробленая па матывах вядомай казкі П. Бажова.

Такія мастацкія вырабы выпускае мінскі фарфора-фаянсавы завод. Гісторыя завода вельмі цікавая. На старым цагляным коміне, які добра захаваўся, значыцца год пабудовы завода — 1890. Ён належаў мясцовым купцам і рабіў тратуарныя пліты і пячную кафлю.

Некалькі год назад завод перабудавалі. Сюды былі дастаўлены аўтаматы для ліцця, штампоўкі і фармоўкі, складзены печы для сушкі і абпалу вырабаў. На прадпрыемства прыйшлі маладыя майстры-мастакі — выпускнікі Рыжскага і Канакоўскага вучылішчаў: Яўгенія Зяцькова, Юрый Данілаў, Марыя Камарова і іншыя. Неўзабаве завод даў першыя вырабы з фаянсу — гаспадарчую пасуду: кубкі, збаны, талеркі, сподкі.

Вялікае народнагаспадарчае значэнне мела асваенне выпуску прамысловых вырабаў: электраізалятараў, ролікаў, утулак, керамікі для электраплітак і прасаў.

Асабліва паспяхова асвойваецца выпуск мастацкіх вырабаў з фарфору. Прыцягваюць увагу вазы з тонкім малюнкам надглазурнай размалёўкі. Тут ад мастака патрабуецца не толькі ўмельства перанесці малюнак з калькі на фарфор, але і веданне ўласцівасцей фарбаў, іх складу, асаблівасцей. Найбольш складаны працэс — роспіс золатам. Ім дасканала валодае Яўгенія Зяцькова.

Акрамя статуэтак і ваз, на заводзе асвоены выраб настольных бюстаў. Нядаўна былі выпушчаны бюсты Суворава, Адама Міцкевіча, Багдана Хмельніцкага. У бліжэйшы час намечана асвоіць выраб бюстаў М. Горкага і Т. Шэўчэнкі.

На здымку: работніца жывапіснага цэха Соф'я **Бокая.**

Энтузіяст культурнай работы

Цяпер цяжка ўдакладніць, чаму год назад у калгасе «Першае мая» Нясвіжскага раёна распаўся харавы гурток мастацкай самадзейнасці. Ды гэта і не так важна. Многія памятаюць іншы факт. Калі аб гэтым стала вядома выкладчыку Нясвіжскага педагагічнага вучылішча Паўлу Мікалаевічу Касачу, ён некалькі дзён хадзіў усхваляваны.

— Як-жа так?.. Не можа быць, каб людзі не жадалі пець... Я паеду туды.

Суседзі пацісналі плячыма.

— Што ты, Павел Мікалаевіч! Твой прыезд становішча не выправіць. Туды трэба сістэматычна наведвацца. А табе праз год сем дзесяткаў будзе. І да калгаса не блізка— больш пятнаццаці кілометраў.

— Усё роўна паеду...—цвёрда вырашыў Касач.

Да Паўла Мікалаевіча ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці аднесліся з недавер'ем. Але першая гутарка ўсё-ж адбылася, ішла размова аб рэпертуары, аб удзельніках, аб лепшых харавых калектывах раёна. Позна ўвечары, калі Касач вяртаўся дадому, ён зразумеў, што калгасны калектыў перарос сябе, што яго ўдзельнікі, як кажуць, варацца ва ўласным соку, а хор з двухгалосага даўно пара перабудаваць на чатырохгалосы. Усе магчымасці для гэтага ёсць. У калгасе многа моладзі, ды і старыя з ахвотай прыдуць на спеўку.

З гэтага часу рэгулярна, два разы на тыдзень Павел Мікалаевіч прыязджаў у калгас «Першае мая». Першыя рэпетыцыі праходзілі не зусім арганізавана

З часам справы пайшлі лепш. Хор пачаў набіраць сілу. А пасля першага невялічкага канцэрта на калгасным сцэне размова аб ім пайшла па ўсіх брыгадах сельгасарцелі. З'явілася многа жадаючых удзельнічаць у хоры. У хуткім часе ў калектыве налічвалася 80 спевакоў. Вызначыліся лепшыя. Прыемным сапрана валодае звеннявая па ільну Ніна Непаканчыцкая, добры слых у брата Ждановічаў. Нядрэнна спявае і пяцідзесяцігадовы Міхась Вараненка.

З кожным наведваннем калгаса ў Паўла Мікалаевіча ўсё больш і больш прыбаўлялася працы. З многімі ўдзельнікамі прыходзілася займацца асобна. Узяць, напрыклад, калгасніка Пятра Кумца. У яго добрыя дадзеныя саліста. Але голас недастаткова распрацаваны. Касач цярпліва, настойліва працаваў з спеваком, папраўляў яго памылкі і нарэшце дамогся свайго. Пётр Кумец пачаў добра спяваць.

Вывучаючы запатрабаванні ўдзельнікаў хору, Павел Мікалаевіч заўважыў, што беларускія народныя песні спеваракамі выконваюцца найбольш удала. Касач развучыў некаторыя з іх: «Зязюленька», «Чарнушачка», «Песня свату», «Было ў бацькі тры сыны» і іншыя.

Праўленне калгаса праявіла клопаты аб сваёй самадзейнасці. Па прапанове старшыні тав. Шчэрбача было адпушчана на набыццё касцюмаў каля трох тысяч рублёў.

Нядаўна ў Нясвіжы адбылося свята песні. У ім прыняў удзел і хор калгаса «Першае мая». Калгаснікі, сельская інтэлігенцыя, вучні, якія прысутнічалі на свяце, адзначылі высокае майстэрства харавога калектыву. 14 песень з рэпертуара хору былі запісаны на плёнку і выконваюцца па рэспубліканскаму радыё.

Каля сарака год Касач нястомна кіруе рознымі харавымі калектывамі. Увесь свой шматгадовы вопыт і веды ён ахвотна аддае моладзі. Але не толькі гэтым характэрны ўдзел Паўла Мікалаевіча ў грамадскім жыцці. Ён — самадзейны кампазітар. Праўда, склалася так, што творчасцю Касач пачаў займацца, калі яму споўнілася 50 год.

Складаючы музыку на тэксты песень рускіх і беларускіх паэтаў, Павел Мікалаевіч шырока карыстаецца матывамі народных мелодый. Вось чаму яго песні простыя ў выкананні, лірычныя, хвалююць слухача. Найбольш удалыя з іх «Калгасная жніўная», «Кланялася жыта» на словы А. Русака, «Хорошо весною бродится» на словы М. Ісакоўскага. Гэтую песню з поспехам выконвае беларускі народны хор. Цяпер Касач працуе над новай песняй «Кукуруза» на словы Я. Коласа.

Нягледзячы на свой узрост, Павел Мікалаевіч працуе многа і напружана. Працоўны дзень яго разлічаны на кожную хвіліну. З раніцы ён заняты ў раённым доме культуры. Увечары едзе ў калгас або ідзе на прадпрыемствы, дзе яго чакаюць удзельнікі самадзейнасці. А прыдзе дадому — гадзіны дзве адпачне, возьме ноты і садзіцца за піяніна.

Так жыве і працуе Павел Мікалаевіч — энтузіяст культурнай работы, усімі паважаны ў Нясвіжы чалавек.

І. СЯМЕНАЎ.

На здымку: самадзейны кампазітар **П. Касач.**

На сцэне раённага дома культуры

За апошні час на сцэне раённага дома культуры і сельскіх клубаў Парыцкага раёна ўсё часцей пачалі выступаць прафесіянальныя тэатральныя калектывы. Знаходзячыся на гастролях у Беларусі, група артыстаў Ансамбля песні і танца Прыбалтыйскай ваеннай акругі пабывала ў Парычах і дала для жыхароў раённага цэнтра цікавы канцэрт.

Гомельскі драматычны тэатр паказаў п'есу «Няшчасны выпадак». Гэты-ж спектакль быў паказаны ў Шацілкаўскім сельскім клубе. На сцэне клуба калгаса «Социялістычны шлях» выступіла з канцэртам група артыстаў Беларускай дзяржаўнай эстрады

І. СТЭЛЬМАХ.

Рамантыка гераізма

«ОЛЕКА ДУНДЗІЧ» У ТЭАТРЫ ІМЯ ЛКСМБ

У апошні час нярэдка папракаюць тэатры, што яны не ствараюць яркіх, прыўзнятых спектакляў, абвінавачваюць іх у няўменні бачыць у жыцці рамантыку, гераізм. Не аналізуючы прычын, якія нараджаюць гэтыя папрокі, трэба сказаць, што сапраўды вельмі мала нашы тэатры працуюць над спектаклямі, у якіх поўна і цікава раскрываўся-б вобраз героя нашых дзён, услаўляліся-б мужнасць, прыгажосць подзвігу, сіла і спрыт, рамантыка глыбокага кахання. Гаворачы аб вобразе станоўчага героя, мы маем на ўвазе, што сіла ўздзеяння мастацтва тэатра павінна дапамагаць выхоўваць у савецкіх людзей, і асабліва ў моладзі, бадзёрасць, смеласць, глыбокую веру ў перамогу нашай вялікай справы, уменне ў пераадоленні цяжкасцей знаходзіць радасць барацьбы. І нездарма савецкія людзі з вялікай цікавасцю глядзяць спектаклі і кінофільмы, чытаюць кнігі, дзе знаходзяць вобразы сваіх сучаснікаў, якія дапамагаюць ім глыбей пазнаць жыццё, вучыцца дзярзаць, быць смелымі і чулымі да чалавека.

Вельмі добра зрабіў калектыў тэатра імя ЛКСМБ, калі ўключыў у рэпертуар п'есу М. Каца і А. Ржэшэўскага «Олека Дундзіч», любоўна і сур'ёзна працаваў над ёй і выніку стварыў запамінальны спектакль аб легендарных днях і героях грамадзянскай вайны.

Спектакль раскрывае хвалюючую тэму глыбокай адданасці свайму абавязку, выкананне якога для героя ёсць справа ўсяго жыцця. Подзвігі Олека Дундзіча абумоўлены яго нязгаснай верай у праўдзівасць і сілу ідэй, за якія ён змагаецца. Гэтая вера фарміруе такія рысы яго характару, як адвага, мужнасць і сапраўды легендарны гераізм у спалучэнні з чалавечай мяккасцю і сардэчнасцю. Уся атмасфера спектакля стварае пачуццё радасці і жыццесцвярджэння.

Вядома, п'еса не пазбаўлена недахопаў. Яна фрагментарная і напамінае хутчэй хроніку. У ёй няма глыбокага раскрыцця характараў. Але галоўная станоўчая не якасць — вобраз цэнтральнага героя п'есы, у якім раскрыты такія рысы, якія робяць Дундзіча прыўзнятым, яркім.

Незвычайнасць паводзін і ўчынкаў Дундзіча — не вынік жадання аўтараў спектакля быць арыгінальнымі дзеля арыгінальнасці. Гэта — неабходнасць, якая праўдзіва знойдзена ў саміх з'явах жыцця і ўмела ўзноўлена сродкамі тэатра.

Гаворачы аб рэжысуры ў спектаклі «Олека Дундзіч», трэба адзначыць удумлівую і сур'ёзную работу В. Малчанава, які знайшоў адзіны стыль усёй пастаноўкі. Цікава вырашана першая карціна, калі на фоне начнога мора застыла шэрэнга салдат. Урачыста гучаць словы пра вернасць абавязку, прысягу каралю, і раптам, нібы яркая ўспышка, — бурны пратэст Дундзіча і яго таварышаў супраць ашуканства, супраць спробы штурхнуць сербскіх салдат на барацьбу з рускай рэвалюцыяй. Добра зроблена сцэна сустрэчы атрада Дундзіча з атрадам Варашылава, сцэна начнога захопу чыгуначнай станцыі.

Скупымі сродкамі вырашана сцэна размовы генералаў Жобера і Мамантава, якія імчацца на аўтамабілі па цёмным стэпе, паказана бязвыхаднасць інтэрвенцыі і яе асуджанасць.

Аднак у радзе карцін рэжысёру здраджвае пачуццё меры. Вельмі нецікава і нават безгустоўна зроблена сцэна ў рэстаране. П'яны надрыў афіцэра Міцькі, хор цыганак і какотка вельмі ўжо шаблонныя і безгустоўныя. Ёсць рад недаробак і ў сцэнах бою, а таксама на балю ў генерала Шкуро. Асабліва сур'ёзныя пярэчанні выклікае эпізод, у якім Дундзіч наперакор характару, і толькі па рэжысёрскаму загаду, праяўляе бессэнсоўную жорсткасць. За парушэнне загаду ён падвяргае свайго лепшага сябра найцяжэйшым выпрабаванням, чаканню выстралу ў спіну. І ўсё гэта робіцца толькі для таго, каб затым зноў заключыць яго ў свае абдымкі.

Поспех спектакля «Олека Дундзіч» у многім залежыць ад таго, наколькі выканаўцу галоўнай ролі ўдалося знайсці зерне вобраза, перадаць складанасць неспакойнай і разам з тым крышталька чыстай натуры героя. Б. Уксусаў знайшоў многа цікавага і яркага ў трактоўцы ролі Дундзіча. Яго герой своеасаблівы, рамантычная прыўзнятасць і страснасць спалучаюцца ў ім з задушэўнасцю і мяккасцю. Рамантычнасць Дундзіча не ў адцягнутых летуценнях, а ў рэальных дзеяннях і барацьбе за шчасце людзей. Уксусаў шырока выкарыстоўвае кантрасты. Яго Дундзіч парывісты, гарачы і, здавалася-б, цяжка паверыць у тое, што праз імгненне Дундзіч пяшчотны і лірычны.

Б. Уксусаў пазбягае дэкларацыйнасці, якая ёсць у тэксце ролі, падкрэсліваючы тым самым важную і складаную гаму пачуццяў героя.

Аднак у Б. Уксусава ёсць цэлыя кавалкі, дзе ён не знайшоў правільнага вырашэння характару. У некаторых сцэнах першай і другой дзеі тэмпераментнасць выканання мяжуе з нервознасцю. Уксусаў—Дундзіч у гэтых сцэнах залішне мітуслівы, унутрана не сабраны і тым самым парушае цэльнасць вобраза. Яўна няўдала вырашана лінія паводзін Дундзіча на балю ў генерала Шкуро. Неабходнай у гэтай сцэне артыстычнасці ў выкананні ролі ўяўнага капітана Дарвіля Уксусаў не дасягнуў. Артыст тут скаваны і напружаны, няма ў яго свабоды дзеяння і паводзін.

У спектаклі нямала ўдалых вырашэнняў і астатніх ролей.

У невялікай, але складанай ролі Будзённага артыст І. Кібіцкі праўдзіва перадае рысы камандзіра Чырвонай Арміі легендарных і суровых год. Вобраз Будзённага, створаны Кібіцкім, не біяграфічны. У ім няма імкнення скрупулёзна перадаць рысы партрэтнага падабенства, але ёсць галоўнае — раскрыццё характару разумнага военачальніка, патрабавальнага, суровага і разам з тым клапатлівага, задушэўнага таварыша. Уся сцэна Будзённага, Варашылава і Дундзіча сыграна з добрым пачуццём такту.

У некалькі іншай, але таксама правільнай манеры створана роля К. Варашылава артыстам П. Маркіным. Акцёр вядзе сваю ролю на стрыманых танах. З Дундзічам ён — суровы і клапатлівы бацька, які разумее, што таленавітасць і палымянасць Дундзіча патрабуе ўмелага і ўважлівага кіраўніцтва. Таму правільна вырашана сцэна, калі, караючы Дундзіча, Варашылаў па сутнасці прапануе меру пакарання выбраць самому вінаватаму. У гэтай сцэне Варашылаў не пагражае, не патрабуе, а пераконвае.

Дундзіч — не герой-адзіночка; разам з ім — яго сябры, такія самыя героі, палымяныя і смелыя, як і ён. Таму так цёпла прымаюць гледачы з'яўленне разам з Дундзічам яго сяброў Паліча (арт Ю. Уласаў), Рашэвіча (арт. Г. Хасьмінскі), Драгіча (арт. Е. Генін), Мірко (арт. Б. Салаўёў). Усе яны нібы складаюць адзіны вобраз, хоць, вядома, кожны з выканаўцаў уносіць свае індывідуальныя рысы ў ролю.

Сябры Дундзіча — не толькі яго землякі, але і байцы Першай коннай арміі. Каларытную і праўдзівую фігуру заліхвацкага кавалерыста — начальніка артзабеспячэння Усатага стварае артыст А. Вятошкін. Пачуццём таварыскасці і любві прасякнуты і характары Карпушына (арт. В. Цыбулька), Казачкі (арт. Т. Чарнышова), Васька (арт. З. Курдзянок) і іншых.

У спектаклі і п'есе значнае месца займае глыбокае пачуццё кахання Дундзіча да дзяўчыны Галіны (арт. Л. Хрол). Каханне гэтае ў Дундзіча такое-ж цэльнае і чыстае, як і яго характар. Дзеля гэтага кахання ён робіць неабдуманы ўчынак, калі ўрываецца ў самае логава ворага. На жаль, вобраз Галіны не пясе ў сабе такога-ж вялікага пачуцця. Роля напісана бледна і схематычна, а тэатр і выканаўца не змаглі да канца пераадолець гэты недахоп.

У спектаклі герою даводзіцца весці барацьбу за свае ідэі і пачуцці з варожымі ідэямі і сіламі. Увасабленнем гэтых сіл выступае былы афіцэр сербскай, а затым белагвардзейскай арміі Ходжыч (арт. С. Яўдошанка). Артыст і рэжысура раскрываюць у вобразе Ходжыча амаральнасць белагвардзейшчыны, у якой гучныя фразы пра абавязак і чэсць прыкрывалі спустошанасць і цынізм. Пярэчанне можа выклікаць толькі сцэна размовы Ходжыча з чыноўнікам, якога ён ашукаў. Больш правільна было-б праводзіць сцэну не ў такім стане ап'янення, як гэта робіць артыст.

Разумным і моцным праціўнікам Дундзіча выступае генерал Мамантаў (арт. М. Абрамаў). Ён проціпастаўляе Дундзічу ўсю сілу белагвардзейшчыны, узброенай першакласнай замежнай тэхнікай. Мамантаў М. Абрамава — вобраз моцнага, але сляпога ворага, які не бачыць усёй безнадзейнасці і асуджанасці белагвардзейскага руху і інтэрвенцыі, не можа зразумець сілы народных рэвалюцыйных мас.

З неабходным тактам, не ўпадаючы ў шарж, праводзіць ролю генерала Жобера арт. С. Юркевіч. Ён стварыў вобраз наёмніка, прывыкшага загадваць і страціўшага ўсю сваю напышлівасць пры сустрэчы з байцамі Чырвонай Арміі.

Спектакль «Олека Дундзіч» у тэатры Ленінскага комсамола не свабодны ад недахопаў, але ён яркі і своеасаблівы. Тэатр раскрыў тэму прыгажосці чалавечага подзвігу, які робіцца дзеля вялікай ідэі, тэму жыцця, пражытага ў імя чалавечай праўды.

В. ЗАХАРАЎ.

На здымку: сцэна са спектакля «Олека Дундзіч». У ролях: Карпушына — **В. Цыбулька**, Олека Дундзіча — **Б. Уксусаў**, Гарбушы — **Г. Хасьмінскі.**

Яўхім КОХАН

Лірычныя мініятуры

ЛЯСНЫ КЛУБ

Людзі йдуць у клуб лясны,
Што ў плакатах з майскіх кветак, —
Рады зноў і зноў яны
Слухаць мову птушыны —
Агітатараў вясны
І прапагандыстаў лета.

МАРЫ І ВОПЫТ

Думы летуценныя заўжды
Б'юць наплывамі марской вады,
Толькі вопыт ўпэўнена грыміць,
Нібы моцны скалісты граніт.

ГАЗЕТА

Газета — трыбуна высокая,
З якой мне відно наваколле,
Як блізкае, так і далёкае, —
Совецкае наша раздолле.

СЛОВА

Хачу я сказаць запаветнае слова сваё —
Няхай больш не муляе, не замінае.
Хоць слоў у адкрытай душы—да краёў,
А я ўсё найлепшых, адзіных шукаю.

САЛАЎІ

У юнацтве я вас і не чуў і не ведаў,
А цяпер, дзе спынюся, куды ні паеду,
На шляху, на жыццёвым маім
Усё пяюць салаўі, салаўі...

Што-ж, відаць, юнакі іх ніколі не чуюць,
Бо чаканых сваіх, бо каханых цалуюць.
А адыйдзе юнацтва ў другія краі —
Кожны скажа: прыгожа пяюць салаўі.

ДОБРЫ ДЗЕНЬ, ЗЯМЛЯ ЦАЛІННАЯ!

... Адмільгалі за акном палеткі Беларусі, шырокія рускія прасторы, чароўны Урал. Цягнік імчыць па шырокіх прасторах Казахстана, куды едзе наш тэатр.

Сюды разам з намі накіроўваюцца дзесяткі эшалонаў моладзі з усіх куткоў краіны. Толькі ў Кустанайскую вобласць ужо прыбыло 34.700 пасланцоў комсамола. У соўгасы «Урнекскі» і «Карабалынскі» чакаецца прыбыццё моладзі Англіі, а ў соўгас «Урыцкі» — юнакоў Балгарыі.

... Першыя сустрэчы нашага калектыву былі з рабочымі Сакалоўскага соўгаса, з будаўнікамі Сакалоўска-Сарбайскага горнабагачальнага камбіната, які знаходзіцца за 50 кілометраў ад Кустаная і з'яўляецца буйнейшай будоўляй шостай пяцігодкі.

У стэпе раскінуліся пасёлкі. Зборныя домікі дзесяткамі вырастаюць за дзень, але будаўнікоў, якія прыбываюць па комсамольскіх пуцёўках, так многа, што тут ужо ўзніклі дзесяткі палатняных гарадкоў. Прыемна адчуваць, што стаіш ля калыскі буйнага прамысловага цэнтра.

Наша брыгада дала чатыры канцэрты будаўнікам у пасёлках Рудны і Комсамольскі, у палатняным гарадку і на аўтабазе. Асабліва гарачым прыёмам карыстаюцца беларускія народныя песні і танцы. Часта канцэрты канчаюцца прамовамі гледачоў, у якіх гучыць шырокая падзяка народу Беларусі, што прымае вялікі ўдзел у асваенні цалінных зямель. На сцэну прыходзяць комсамольцы, пажылыя людзі і ўсе ад шчырага сэрца паціскаюць рукі.

Наша брыгада выступіла таксама ў Амангельдынскай МТС і ў клубе Кустанайскага будтраста. За першыя шэсць дзён мы далі 18 канцэртаў, на якіх прысутнічала восемь тысяч гледачоў.

Едзем у калгасы і соўгасы Урыцкага раёна і раёна Карасу Кустанайскай вобласці. Будзем выступаць галоўным чынам на палявых станах.

29 ліпеня наш калектыў быў запрошаны на сустрэчу працоўных цалінных зямель Кустанайскай вобласці з першым сакратаром ЦК КПСС Н. С. Хрушчовым, якая адбылася на аэрадроме Кустаная. Перад пачаткам мітынгу мы праспявалі некалькі песень.

Асабліва хвалюючая сустрэча была ў соўгасе, які носіць назву нашага роднага Мінска. Тут да 70 працэнтаў жыхароў—пасланцы Мінска, Гомеля, Барысава, Слуцка. Соўгас размешчаны ў поўночнай частцы Кустанайскай вобласці. Ён раскінуўся на берагах двух жывапісных азёр — Балакты і Сорку. Вечарам соўгасны клуб запоўнілі хлебаробы, трактарысты, камбайнеры. Сыплюцца пытанні аб Мінску, аб беларускім ураджаі. Пачынаецца канцэрт. Песня аб Нёмане, танец «Юрачка» і іншыя нумары паўтараюцца па некалькі разоў.

Назаўтра наша брыгада наведала землякоў, якія за 8 кілометраў знаходзіліся ў палявым стане і не маглі прысутнічаць на канцэрце. Наша зямлячка — выхаванка Дараганаўскага дзіцячага дома — трактарыстка 1-й брыгады Алена Каўтун расказала аб рабоце комсамольцаў-беларусаў па асваенню цалінных зямель. Сама яна трымала першае месца ў правядзенні веснавой пасяўной кампаніі і мае грамату Ведзенскага райкома комсамола. Яна ўзяла абавязацельства правесці ўборку за 12 дзён. Затым землякі пазнаёмілі нас з тэхнікай, паказалі свае палі і пазнаёмілі са спосабам раздзельнай уборкі, на якую ўпершыню перайшлі яны ў гэтым годзе.

На развітанне нашы землякі Каўтун Алена, Мароз Алена з Нова-Барысава, Іваноўская Галя з Грэска і іншыя прасілі перадаць прывітанне Мінску, сваім сваякам і знаёмым.

Наш аўтобус бяжыць на поўдзень Кустанайскай вобласці, сярод мора спелай пшаніцы. Уперадзе яшчэ многа хвалюючых сустрэч.

С. ПЯТРОВІЧ,
артыст Беларускага тэатра юнага гледача.
Кустанай.

„БЕЛАЯ АКАЦЫЯ“

Спектакль Растоўскага тэатра музычнай камедыі

Гледачам Мінска добра вядомы Растоўскі тэатр музычнай камедыі па мінулых гастролях. Калектыў тэатра прыцягнуў да сябе ўвагу цікавым і рознастайным рэпертуарам, добрым складам салістаў, зладжанасцю аркестра, хору, балету, удумлівасцю музычнага і рэжысёрскага вырашэння спектакляў.

У гэтым годзе тэатру споўнілася дваццаць год. Па існуючай яшчэ, на жаль, традыцыі, у юбілейныя дні часцей за ўсё гавораць толькі аб добрым, што ёсць у дзейнасці, у творчасці юбіляра, імкнуцца не бачыць яго хібаў. Але вера ў таленавітасць растоўскага калектыву, у тое, што ён таварыскую крытыку ўспрыме як імкненне дапамагчы ў далейшай працы над спектаклем, дае права пагутарыць аб яго пастаноўцы «Белай акацыі» — першага твора, паказанага нашаму гледачу.

«Белая акацыя» (музыка І. Дунаеўскага, тэкст В. Маса і М. Чэрвінскага) — музычная камедыя аб жыцці і дзейнасці экіпажа кітабойнай флатыліі «Салют». Музыка аперэты належыць да лепшых дасягненняў совецкіх кампазітараў у гэтым жанры. Яна іскрыцца весялосцю і задорам, хвалюе пранікнёным лірызмам, захапляе майстэрскай абмалёўкай вобразаў як станоўчых, так і адмоўных. «Белая акацыя» — адна з тых, пакуль яшчэ нямногіх музычных камедый совецкіх аўтараў, дзе ёсць што спяваць і салістам і хору, ёсць што іграць аркестру.

Але шмат дакораў трэба зрабіць аўтарам п'есы за слабасць драматургіі і няяснасць паводзін асобных герояў.

Адна з галоўных ліній твора—каханне радысткі Тоні Чумаковай (арт. Н. Антонава) да капітана Косці Купрыянава, які яе не заўважае і кахае разбэшчаную дзяўчыну Ларысу Штэпенку (арт. Е. Камарова). Толькі ў самым канцы спектакля Косця адвяргае Ларысу і прызнаецца ў каханні Тоні. Але, каб пакахаць яе, герой павінен быў убачыць, што яна лепшая за Ларысу. У гэта павінны паверыць і гледачы не таму, што Тоня выконвае станоўчую ролю, а Ларыса адмоўную, а таму, што вобраз першай дзяўчыны больш прывабны, высакародны, натхнёны, чым другой.

На жаль, у спектаклі гэтага не атрымалася. Выканаўцы ролі Тоні не хапіла неабходных якасцей, каб стварыць такі вобраз. У ім няма адчування маладосці, высокіх пачуццяў. Гэта падменена надрывам, нават істэрычнасцю (у сцэнах на караблі). Роля Тоні—адна з найбольш пеўчых у камедыі, але выканаўцы не хапае гэтых дадзеных, часам яна нячыста інтаніруе. Тоня ў спектаклі не вабіць. Яна не можа засланіць бліскуча створанага вобраза Ларысы.

Яшчэ адна паралель. Знатны гарпунёр Чумакоў (арт. А. Шылін), зусім зразумела, павінен з пагардай паставіцца да спекулянта і марнатраўцы Яшы Наканечніка (арт. А. Алеграў). Але вобраз Яшы пакідае большае ўражанне, і сумленны, але мітуслівы, бурклівы стары Чумакоў робіцца побач з ім бледным вобразам.

Тая-ж аднастайнасць паводзін, няўменне знайсці неабходныя рысы, каб паказаць душэўнае багацце, новыя якасці, якія адрозніваюць вобраз сучасніка ў музычнай камедыі ад традыцыйнага героя, характэрны і для арт. П. Нікіфарава—Косці Купрыянава. Яго герой меланхалічны, саладжавы любоўнік, але не валявы совецкі кітабоец.

У такім-жа традыцыйным плане, без адчування спецыфікі вобразаў сучаснікаў паказаны і астатнія героі спектакля. На жаль, пачуццё меры здрадзіла пастаноўшчыку (Ю. Генін) у сцэнах з кінарэжысёрам, дзе гратэскавасць дайшла да алагічнасці.

Не менш здзіўляе і так званы «самадзейны трапічны ансамбль» з другой дзеі, у якой паказваюцца кафэшантанныя танцы, якія нічога агульнага не маюць з мастацкай самадзейнасцю маракоў (балетмайстар Е. Секержынскі). Нагул свята Нептуна ў гэтай дзеі вельмі статычнае. Няма выразнай канцоўкі ўсяго спектакля.

Да ўдач «Белай акацыі» трэба аднесці рэжысёрскае вырашэнне першай дзеі. Вельмі добра гучыць аркестр (дырыжор В. Беліц). Пудоўныя дэкарацыі адэскага дворыка на беразе мора і карабля ў паходзе зрабіў мастак І. Аруцюнян.

Калектыў Растоўскага тэатра патраціў на пастаноўку «Белай акацыі» шмат працы, але эфект ад спектакля не такі, якога трэба было чакаць. Нам здаецца, гэта адбылося таму, што твор прачытаны ў традыцыйнай аперэтачнай манеры, без дастатковага ўліку яго сучаснай тэматыкі.

І. НІСНЕВІЧ.

На здымку: сцэна з аперэты «Белая акацыя». Тоня — артыстка **Н. Антонава**, Лапаценка — артыст **О. Зубараў**, Велікана ў — **А. Логінаў.**

Фото **І. Салавейчыка.**

Васіль ВІТКА

Палёт Чмяля

КАМЕДЫЯ У АДНОЙ ДЗЕІ

Прыёмная дырэктара музычнай школы. Стол сакратара-машыністкі. Тэлефон. Гардэробная шафа. Партрэт Рымскага-Корсакава.

Пры сцяне на канапе з валейбольным мячом на каленях сядзіць хлапчук, гадоў дванаццаці-трынаццаці. Гэта з тых дзяцей, на абліччы якіх ужо можна прачытаць першыя рысы, добра знаёмыя нам па творах і некаторых дарослых. Шчасце? Не. Хутчэй асалода. Як добра, што я ёсць на свеце. Не таму, што жыццё адкрывае перада мной штодня свае новыя таямніцы і нечаканыя цяжкасці,—не. Я рад, што ўсё ёсць так, як ёсць, што ёсць тыя, каму належыць думаць і клапаціцца пра мяне.

Воддаль, на кволым венскім крэсле — дзяўчынка. У футляры перад сабой яна трымае віяланчэль. Хоць адразу і можа кінуцца ў вочы смешная неадпаведнасць паміж вялікім інструментам і яго маленькай уладальніцай, але гэта не так. У тонкіх руках дзяўчынкі, ва ўсёй яе паставе прыкметна тая ўпэўненасць, якую чалавек змалку пачынае набываць практыкай, вопытам, сваёй дапытлівасцю, калі радасць першых адкрыццяў дае яму і ўсведамленне сілы: я сам! Вялікая віяланчэль, зачыненая ў футляры, для яе малой гаспадыні—паслухмяная істота. Цяпер яна, відаць, спачывае, а можа і заснула — няхай паспіць, бо тым часам і апроч музыкі ёсць на свеце не менш цікавыя рэчы.

Вось хлапчук... Пэўна, ужо надакучыла яму і падкідаць мяч угору, і біць яго далоняй аб падлогу. Ды стаміўся і сам мяч. Спярша лёгкі і вясёлы, ён падскакваў як на спружынах, а цяпер... Дыхавіца на яго напала, ці што? Хлапчук трасе мяч. Потым прыкладае да вуха, выслухоўвае. Не, тут патрэбны радыкальныя меры. З усяе сілы ён сціскае мяч—той робіць цяжкі і сумны ўздых. Ім можна паляскаць па далоні, па канапе, па падлозе і нават па строгім сакратарскім стале...

Не, тут цяжка вытрымаць ролю безуважнага сведкі. Асцярожліва паставіўшы ў кут віяланчэль, дзяўчынка падыходзіць да хлопчыка:

— Трэба надзьмуць яго нанава.

— Я і без цябе ведаю.

— Дай я.

— У цябе духу не хопіць.

— Ты думаеш, я слабая? Вось паглядзіш—як дзьмуху!

— Гы-гы-гы! Яна дзьмухне... На, дзьмухні.

Узяўшы капшук, дзяўчынка з усяе сілы дзьме ў трубку:

— Пфу! Пфу!

— Гэта табе не на бандуры пілікаць,— паказваючы на віяланчэль, зласліва гаворыць хлапчук,—мала кашы ела.

— А ты многа еў. Таму такі і тоўсты.

— Аддавай.

— На.

Пакрыўдзіўшыся, яна садзіцца на сваё месца і стараецца больш не глядзець у той бок.

Хлапчук, счакаўшы хвіліну, пачынае надзімаць мяч. Напінаецца ўся хлапчукова постаць, чырванню наліваюцца круглыя шчокі, лезуць на лоб вочы. Дзяўчынка ледзь стрымлівае свой смех. Але вось худыя, запалыя бакі ўпартае гумы пачынаюць дыхаць, падымаюцца. І хоць рана яшчэ абвяшчаць перамогу, хлапчук ужо не хавае сваёй упэўненасці. Мяч расце, напінаецца, становіцца цвёрдым і вось-вось зазвініць, як нацятая струна. Цяпер галоўны клопат—не выпусціць і кроплі паветра назад, заціснуць трубку пальцамі так, каб...

— Ах!—закрывае рукамі вочы дзяўчынка. Толькі гэта не ўсклік радаснай помсты. Гэта крык спачування і невыказнага жалю, крык, які пачуўся і сціх адначасна з выдыхам паветра, што здабывалася з такімі пакутамі. Яна ледзь стрымлівае на вачах слёзы. Яна гатова раздзяліць цяжар няшчасця.

— Давай я цяпер...

— Не.

— Ты стаміўся.

— Я аддам Арцёму, ён — насосам...

— Твой брат?

— Шафёр.

— Вашай школы?

— Якое табе школы. Наш. Майго тату возіць.

— А як ты завешся?

— Юра.

Ён спрытна ўзлазіць на падаконнік, каб дастаць форткі.

— Арцём! Арцём! Што ты, заснуў там? Надзьмі мяч, чуеш? Насосам. Лаві!

— Ты сюды з татам прыехаў?

— Ого, чаго захацела.

— Добра, у каго тата...

— А ў цябе няма?

— Няма, Юра. Яго забілі на вайне...

— З мамай жывеш?

— І мамы ў мяне няма, Юрачка. Памерла мая мама, Юрачка...

— Гм... гм... А цябе як зваць?

— Марфа.

— Гы-гы-гы! Марфа. І выдумала-ж.

— Не смейся. Гэта дзедка так мяне называе, а ў метрыках я запісана Марынка.

— То няхай твой дзед пазвоніць і скажа, што ты сірата. Без усякага экзамену пройдзеш, у першую чаргу.

— Чаго майму дзедку званіць. Ён тут сам працуе. І дырэктара, і ўсіх педагогаў ведае.

— О, у цябе, значыць, блат!

— Не, наша прозвішча — Хадаркевіч. Блат—гэта прафесар. Сігізмунд Германавіч Блат, якраз па майму класу.

— Ай, і смешная-ж ты, не разумееш нічога. Рука ў цябе значыць тут. Чаго-ж баяцца? Пройдзеш як па масле. А па якому ён класу?

— Хто?

— А дзед твой.

Марфачка нават сумелася ад такой нечаканасці:

— Ён па ўсіх класах... Яго тут усе любяць... Ён тут швейцар.

— Ха-ха-ха! Гэта з барадой каторы? Ха-ха-ха! Не выкруціцца табе ад экзамену.

— Без экзамену я і не хачу. Дзедка кажа, што экзамен не цяжкі. А ён знае музыку. І вельмі любіць слухаць. Віяланчэль мне ад мамы засталася. Я іграю, а ён слухае. А бывае, слухае ды заплача. Не плач, кажу, дзедка...

— Хто-ж цябе вучыў?

— Дзедка педагога наймаў...

Аднак сямейная гісторыя Хадаркевічаў не выклікае асаблівай цікавасці ў новага марфаччынага знаёмага. Ён з асалодай пазяхнуў, патоўк перад сабою кулакамі паветра, потым зноў ускочыў на падаконнік і расчыніў акно:

— Арцём! Даволі там валаводзіцца. А, гатоў! Кідай.

Мяч весела ўлятае ў акно.

— Хоп!.. Давай папасуемся.

— Давай.

Гульнёй захапляюцца не толькі тыя, хто гуляе, але і сам мяч. Гарэзліва, як неаб'езджаны жарабок, ён падбрыквае ад незразумелай радасці. То ўскочыць на стол, то на шафу, то схаваецца за партрэтам. Але вось ад заліхвацкага ўдару ўжо не далоні, а грузнага чаравіка ён з усяго маху нечакана б'е ў дырэктарскія дзверы.

— Калі ласка! Прашу!..

Адразу можна адчуць, што дырэктар з тых людзей, якія любяць свой голас і дасканала валодаюць усімі яго адценнямі. Невядома, хто стукае ў дзверы, але наколькі стукае ўладарна, без дробнага далікацтва, значыць, пэўна той, хто не спыняецца ў прыёмных і ў чужы кабінет ідзе, як у свой уласны.

— Прашу, прашу... — гаворыць дырэктар, шырока расчыняючы на абедзве палавіны дзверы кабінета. З-за дырэктаравых плячэй выглядае твар сакратаркі. Уласна кажучы, выглядае не сам твар, а цяжкія рагавыя акуляры, якія і з'яўляюцца самай адметнай рысай аблічча сакратаркі. Адказнасць ёсць адказнасць, і не будзеш-жа сядзець пры салідных дзвярах з нейкім там мілым кірпатым носікам на твары і каб усе бачылі, як скачуць вясёлыя зайчыкі ў тваіх хітраватых вачанятах, і як здрадлівая ўхмылка выдае цябе на кожнай хвіліне. Не! Начальства не любіць лёгкага пырхання ўсякіх там матылькоў каля сваіх дзвярэй. Гэта і для аўтарытэту ўстановы небяспечна, ды і для самога... «Што гэта ў цябе—прыёмная ці танцпляцоўка?» Сакратаркі—народ кемісты. Нават неабстрэленая выпускніца дзесятага класа, што рашыла прысвяціць сваё жыццё высокаму служэнню ў прыёмнай, і тая разумее: на сур'ёзным пасту трэба быць сур'ёзнай. «Графа Мантэкрыста» на стол не выкладзеш. На стале—цыркуляры і інструкцыі. Але пагляд сакратаркі прыкаваны не да стала. Яе вочы скіраваны трошачкі ніжэй—у стол. Там—запаветны граф. У выпадку з'яўлення непасрэднага начальніка або незнаёмага падазронага партфеля ці капелюша дастаткова толькі злёгку нахіліцца над сталом—шчоўк, і граф у надзейным сховішчы. Нават і на думку нікому не прыдзе, каб такая строгая сакратарка — у акулярах!— займалася нечым іншым, апроч загадаў, стэнаграм і пратаколаў. Акуляры — надзейная гарантыя службовай саліднасці.

— Прашу... — паўтарае дырэктар. І раптам ласкавыя адценні яго голасу рэзка мяняюцца. У кутку, за футлярам віяланчэлі, стаіць спалоханая нечаканасцю, разгубленая дзяўчынка, а ля самых дзвярэй — хлапчук з валейболам пад пахай. Нават і знаку вінаватасці няма на яго адкрытым, крыху задзірлівым абліччы.

— Хто стукаў у дзверы?

— Мячык...—толькі і паспявае вымавіць Марфачка.

— Мячык? Што-ж тут вам — школа ці стадыён?.. — Мая Кірылаўна, — звяртаецца ён да сакратаркі, — іх прозвішчы? Хто іх сюды пусціў?

Ён здымае трубку тэлефона:

— Швейцара да мяне.

— Дарафей Панцялеевіч, гэта не нашы вучні...—тлумачыць сакратарка.

— Мы хочам быць вашымі...—устаўляе дзяўчынка.

— Ах, вы хочаце?—здзекліва пацяшаецца дырэктар. — Ну, дапусцім, што ты хочаш— я магу гэтаму паверыць. А вось чаго ты сюды прышоў, малады чалавек, са сваім футболам?

— Гэта не футбол, а валейбол...—дае аўтарытэтную даведку юны спартсмен.

— Мая Кірылаўна, вы чуеце?

— Так, Дарафей Панцялеевіч, гэта сапраўды валейбол.

— Ды мне адзін чорт: футбол, валейбол. Якое ўсё гэта мае дачыненне да маёй школы? Да школы вялікага Корсакава?

— Звалі, таварыш дырэктар?—высоўваючы галаву з дзвярэй, пытаецца стары Хадаркевіч.

— Дзедка!.. Мячык сам адскочыў і ўдарыў...

— Каго ўдарыў? Я табе казаў, Марфачка, сядзі і чакай.

— Унучка?

— Марфачка, Дарафей Панцялеевіч.

— А гэта Юра,—спяшаецца растлумачыць Марфачка.—І ён хоча здаваць экзамен...

— Экзамен? Ха-ха-ха! Па якому-ж класу?

— Па блату...—не трацячы высокай годнасці, абвяшчае Юра.

— Ты што-ж, знаёмы Сігізмунда Германавіча, ці цябе хто рэкамендуе?

— Ды мама ўсё назвяле. Праходу ад яе няма. Паступай і паступай. Цябе, кажа, па блату прымуць. Мама то хоча, каб я на скрыпцы... А я, як паглядзеў, што Марфа вунь якая малая, а на гэтай махіне навучылася, дык і я рашыў. А навучуся — мама сказала, матацыкл купіць.

— Сідар Пятровіч!—ужо не стрымліваючы свайго абурэння, крычыць швейцару дырэктар.—Вы не першы год у музыцы. Навошта вы пусцілі гэтага бурбона сюды? Каб псаваць мне нервы? Вы самі маглі зрабіць заключэнне і выставіць яго... і выставіць яму... бал! Не, вы толькі паслухайце—сыночку слон на вуха наступіў, а мамачка раптам адкрывае ў ім талент. Яна ўжо і прэмію вызначыла. А ты тут таўчы

ШУКАЦЬ СВОЙ ШЛЯХ

Дзесяць невялікіх апавяданняў, якія складаюць новую кнігу маладога беларускага празаіка Міколы Ракітнага «Вячэрнія зоры», — гэта дзесяць звычайных жыццёвых гісторый, у якіх аўтар імкнецца прыцягнуць нашу ўвагу да тых ці іншых з'яў рэчаіснасці, да таго, як складаюцца іншы раз узаемаадносіны і лёс людзей. Пісьменнік у большай частцы не прэтэндуе на глыбокія абагульненні, не імкнецца ўзняць нейкія праблемныя пытанні. Яго апавяданні хутчэй за ўсё — жывыя замалёўкі, цікавыя эцюды з натуры. Ёсць сярод іх праўдзівыя, напісаныя з настроем, з пачуццём. Такія апавяданні, як, напрыклад, «Сашка», «Вясна», «Акварэльны эцюд», «Адзін», непасрэдна падслуханы, падгледжаны аўтарам у жыцці, выклікаюць давер да пісьменніка, абуджаюць роздум над прачытаным.

Іншыя яўна прыдуманыя, штучныя, як, напрыклад, «Сёстры», «Лектар», «Вячэрнія зоры». Яны выглядаюць занадта літаратурнымі і не выклікаюць у чытача адпаведных пачуццяў і думак.

Але, калі гаварыць аб тым, што характарна для зборніка ў цэлым, дык трэба адзначыць добрую назіральнасць пісьменніка і той лірычны настрой, якім прасякнута кніга, задушэўнасць, з якой апавядае аўтар аб сваіх героях, аб чалавеку.

Іменна гэтымі якасцямі вызначаецца апавяданне «Сашка» — аб недаравальных памылках, якія робіць маладосць, прагледзеўшы сапраўдныя пачуцці і прыняўшы закаханасць за любоў. З вялікай сімпатыяй малюе аўтар вобраз калгаснага хлопца Сашкі, які марыць аб стварэнні ў калгасе свайго рыбатадавальніка, ведае ўсе звычкі тупаносых залацістых карпаў, што так смешна б'юцца ў часе кармлення. Гэты балагур і весяльчак рантам бянтэжыцца пры адным толькі ўпамінанні пра Сухадол, дзе жыве Дуся, нявестка старога Пракопа, з якім Сашка гаспадарыць тут на сажалках.

Паэтычна, задушэўна гаворыць расказчык пра Дусю — насмешніцу і свавольніцу, якая ашукалася ў сваім выбары; пра тую дзявочую збянтэжанасць, якую яна стараецца нічым не выдаць, зноў убачыўшы Сашку.

Той-жа добрай назіральнасцю, паэтычнасцю, дакладнасцю мастацкіх дэталей вызначаецца апавяданне «Вясна», якое прасякнута ціхай радасцю светлых пачуццяў, подыхам і фарбамі, што нясе ў сабе гэтая пара года і маладосць.

Пераходам ад замалёвак да больш сур'ёзнага і глыбокага раскрыцця характараў, спробай закрануць жыццёвыя з'явы служыць апавяданне «Адзін». Гэта гісторыя чалавека, які заблытаўся на нялёгкіх жыццёвых шляхах, збіўся на крывую сцежку ў пошуках лёгкага хлеба і лёгкага шчасця. Моцна, пераканальна гучыць уступ да апавядання. Адзінокім, жорстка пакараным маральна, страціўшым павагу блізкіх і землякоў паўстае перад намі герой апавядання Антон Марэнчык. Жывая зацікаўленасць аўтара ў лёсе героя, вельмі праўдзівыя і пераканальныя штрыхі ў абмалёўцы яго вобліку, дзе вельмі многае сказана ў падтэксце, напаўняе апавяданне глыбокім унутраным сэнсам. І нам ужо хочацца разгадаць гэты сэнс, зразумець што-ж адбылося з гэтым чалавекам у жыцці.

Аднак, паведаміўшы нам гісторыю Антона Марэнчыка, пераканальна паказаўшы, што ні доўгі рубель, ні лёгкі хлеб не прынеслі герою шчасця, пісьменнік усё-ж не адказаў на пытанне, якое немінуча ўзнікае,—што-ж прымусіла Антона, чалавека безумоўна працавітага і не лёгкадумнага, пакінуць калгас і шукаць заробку ў горадзе? У выніку жыццёвая праўда паказана ў апавяданні хаця і ярка, але аднабакова.

Недахопы такога роду ў яшчэ большай ступені даюць сябе адчуваць у іншых, больш ранніх па напісанню апавяданнях. Цікавае па тэме апавяданне «Сёстры». Але слізгаючы па паверхні фактаў, спрабуе аўтар супрацьпаставіць тут маральныя якасці двух сясцёр—«гарадской» і «сельскай». Жадаючы разынчаць Эму, якая паспрабавала асалоду «прыгожага» гарадскога жыцця, паехала ў горад вучыцца, але не давучылася, паступіла працаваць на фабрыку, але і тут нічога добрага не дабілася, аўтар прапануе нашай увазе тыповы ўзор фельетоннай гераіні, гэткай мяшчанкі з прэтэнзіяй. Яе называюць не Эмай, а Паэмай. У яе заведзены спецыяльны альбом, дзе запісваюцца пашлаватыя вершыкі. Прыехаўшы дадому на адпачынак, яна гаворыць з роднымі няйначай, як наступным чынам: «Хацела паехаць куды-небудзь на поўдзень — у Крым, на Каўказ... А пуцёўку далі ў Ждановічы... Які інтэрас!.. А-ат, ні мора, ні гор.. Ніякай экзотыкі...»

«Горад ёсць горад, Настачка... Паркі, тэатры, маладыя людзі, знаёмствы... Усё гэта цікава толькі тады, калі ведаеш, што цікавіцца і табою...»

Настачка простая процілегласць Эме. Калі Эма прыгажуня, Настачка — непрыгожая, калі Эма зазнайка, Настачка — сціплая. Настачка прывезла сястры ў падарунак вельмі прыгожае крэндэшынавае плаццe і ў даваршэнне ўсяго ў Настачкі зэле на грудзях ордэн. Адным словам, Настачка адрозніваецца ад сястры высокімі маральнымі і душэўнымі якасцямі. І ўсё гэта таму быццам-бы, што Эма жыве ў горадзе, а Настачка ў вёсцы. Не дзіва, што знаёмы Эмы — студэнт аддаў перавагу малодшай сястры.

Эме нічога не заставалася, як тэрмінова перавыхаваццa, што яна і зрабіла. Заплакаўшы, пакорна выслухала павучанні сястры і праз слёзы вымавіла: «Вельмі дзякую табе, Настачка».

Пісьменнік яўна не здолеў пранікнуць тут у глыбіню тэмы, не перажыў яе, не знайшоў пераканальных довадаў і фарбаў, каб увасобіць у мастацкую форму сваю ідэю. Вобразнае бачанне падменена чыста вонкавым просталінейным супрацьпастаўленнем не пераканальных характарыстык.

Пісьменнік тут ідзе не ад жыцця, а ад надуманай схемы, літаратурнай «выдумкі». Гэта — загана многіх апавяданняў Ракітнага. То ён спрабуе штучна заінтрыгаваць чытача ў добрым апавяданні «Акварэльны эцюд», разыгрываючы няведанне і здзіўленне расказам мастака Вашкевіча, хаця чытач з самага пачатку распазнаў у гэтым чарговы літаратурны прыём. То ў лёгкаважнім апавяданні «Лектар» прымушае калгаснага вартаўніка заклікаць да працавітасці сваю спадарожніцу, а затым разгублена ўздыхаць, даведаўшыся, што яна Герой Сацыялістычнай Працы і едзе ў калгас чытаць лекцыю. На думку аўтара, гэта павінна выглядаць забаўным, але чытач застаецца роўнадушным да штучных хітрыкаў, бо за імі няма глыбокага зместу, няма пісьменніцкага погляду на з'явы жыцця.

Лепшыя рэчы ў зборніку сведчаць аб добрых творчых магчымасцях пісьменніка. Трэба толькі больш упарта шукаць, глыбей пранікаць у жыццё, больш раздумваць над з'явамі рэчаіснасці — у гэтым крыніца сваіх адметных тэм, свайго погляду, сваіх адносін да навакольнага.

Алег СУРСКІ.

Мікола Ракітны. «Вячэрнія зоры». Дзяржаўнае выдавецтва БССР. Мінск, 1956.

Творы З. Бядулі на літоўскай мове

У Вільнюсе ў Дзяржаўным выдавецтве мастацкай літаратуры Літоўскай ССР выйшаў зборнік Змітрака Бядулі «Сярэбраная табакерка» ў перакладзе з беларускай мовы Альбінаса Жукаўскаса. Кніга складаецца з трох раздзелаў. У першы ўвайшлі навелы з кнігі «Абразкі», у другі — рад апавяданняў пісьменніка і ў трэці — казка «Сярэбраная табакерка». Уступны артыкул аб творчасці вядомага беларускага пісьменніка напісаны перакладчыкам. Тыраж кнігі 8 тысяч экземпляраў.



Цэнтральны маскоўскі стадыён імя В. І. Леніна, дзе адбываецца Спартакіяда народаў СССР.

Фото Н. Граноўскага. (Фотахроніка ТАСС).

Калі канфлікты выпадковыя...

Лірычная хроніка Міхася Калачынскага «Дажынкі ў Каласоўцы» прысвечана сучаснаму жыццю калгаснай вёскі.

Камбайнерка Аўдуля Аверчанка прыязджае з МТС на самаходным камбайне на ўборку ўраджаю ў родныя мясціны. Былы аграном Максім Коршык, які працуе нарміроўшчыкам на аўтазаводзе, кахае Аўдулю і збіраецца неўзабаве прыехаць у Аўдуліну вёску Каласоўку. Ён пасылае каханай тэлеграму і пісьмо. Аўдуля не сыйшла з камбайна, каб атрымаць карэспандэнцыю, і калгасны паштальён Нікіпар Шамша пакінуў коршыкавы пасланні на полі. Лінуў дождж, і тэлеграму з пісьмом змыла вадой.

Прыблізна ў гэты-ж час Нікіпар губляе адрасаваную старшыні калгаса Івану Каліне дэпешу з абкома комсамола і не прызнаецца ў гэтым.

У Каласоўку неадоўга прыязджае Максім. Паміж ім і Аўдуляй узнікаюць непаразуменні з-за таго, што Аўдуля не прачытала яго пісьма. Непаразуменні гэтыя высветліліся-б хутка, калі-б Аўдулю не паклікалі тэрмінова «ратаваць» Нікіпара Шамшу, які не мог спыніць адрамантаваны ім стары цягач.

Праз нейкі час Нікіпар Шамша і старшыня калгаса, ідучы на паляванне, сустракаюць моладзь суседніх вёсак, што спяшаецца на свята песні. Іван Каліна не можа ўспомніць, каб хто калі гаварыў яму пра свята, а Нікіпар здагадваецца, што напамінак быў у згубленай ім дэпешы, але маўчыць. Калі паляўнічыя трапілі ў млын, там у той-жа момант знайшлася згубленая дэпеша, якая аказалася ў мяху са збожжам у цёткі Анісі. Пасароміўшы Нікіпара, Каліна загадвае яму бегчы клікаць людзей на свята.

У Каласоўцы-ж у гэты час калгаснікі «атакуюць» намесніка старшыні Сымона Цяцеру:

— Дык хто, намеснік,
Нам спяваць забараніў,
Праваронію свята песні?
. . . . . .
— Бюракрат!
— Давай, звані
На яго ў бюро райкома!

У самы напружаны момант з'яўляецца Нікіпар Шамша з заклікам накіроўваецца на свята і прыходзіць тэлеграма, у якой Коршык паведамляе, што назусім едзе ў Каласоўку. Усе накіроўваюцца на свята песні.

Такі, коратка, сюжэт хронікі. Ужо ў гэтым пераказе кідаюцца ў вочы надуманыя канфлікты, на якіх трымаецца сюжэт. У аснове абодвух канфліктаў — непрачытаныя письмы. Стараецца ўражанне, што калі-б даждж не змыла пісьмо Коршыка і калі-б Нікіпар не згубіў дэпешу абкома, дык усё ў Каласоўцы ішло-б гладка.

Пакінуўшы ў баку рэальныя жыццёвыя супярэчнасці, падмяніўшы іх выпадковымі, надуманымі канфліктамі, аўтар тым самым збядніў паказ людзей. Персанажы хронікі не ўплываюць на падзеі, а самі знаходзяцца ў палоне выпадковасцей. Яны дзейнічаюць не па ўнутранай логіцы — пісьменнік сілай заганяе іх у рамкі надуманых канфліктаў.

Што-ж датычыць канфлікта паміж Аўдуляй і Коршыкам, то аўтар фактычна толькі намеціў яго. Адчуваючы, што размытага даждж пісьма недастаткова для ўзнікнення істотных непаразуменняў паміж закаханымі, аўтар, як гэта робіцца ў даволі танным вадэвілі, уводзіць выпадак з Нікіпарам на цягачы. Гэта на некаторы час выратоўвае надуманы канфлікт ад самавырашэння. Але не на доўга.

У творы сапраўды канфліктныя сутыкненні персанажаў падменены выпадковасцямі ў абставінах, таму тут няма і ўнутранага канфлікта, які-б дапамагаў раскрыць характары герояў. Слабасць хронікі ў тым, што героі не раскрываюцца толькі знешне, прытым толькі ў апісаннях, а не ў дзеянні.

Што чытач даведваецца, напрыклад, пра Нікіпара Шамшу? Толькі тое, што ён працуе паштальёнам, мае дзеда, кахае даярку Тэклю (якая, дарэчы, так і не паказалася ні разу ў хроніцы), піша ёй вершы, іншы раз можа зманіць (выпадак з дэпешай), аматар палявання, тэхнікі, самакрытычны (калі абставіны прыціснуць): «Я не пісьмо — сумленне, давер людзей згубіў», ды яшчэ некалькі партрэтных рыс.

Пра Аўдулю вядома толькі, што яна добра працуе, кахае Коршыка. Пра іх каханне паэт расказвае даволі штампавана:

Тады яна была
На курсах камбайнераў,
Тады зарок дала
Дружыць,
і ён паверыў.
Вясна спявала ім.
У садзе на вярбінах
Штовечар салаўі
Гукалі іх, любімых.(?)

Вядома яшчэ, што Аўдуля карыстаецца аўтарытэтам сярод калгаснікаў — ёй даверяюць размову з Сымонам Цяцерай наконт свята. Усё, што мы ведаем пра гераіню, — расказана, а не паказана аўтарам.

Сымон Цяцера — бюракрат («Песні пець... на гэты конт мы чакаем дырэктывы») — прыпасены аўтарам якраз на момант, калі згодна сюжэту трэба, каб хто-небудзь замінаў ехаць на свята. Ён выступае ў творы, так сказаць, «рупарам бюракратызма».

Таксама, як і Цяцера, не выпісаны і астатнія героі другога плану. Аўсей Шамша існуе ў хроніцы толькі для таго, каб сказаць пару слоў пра радыёвузел, гаварыць пра кнігі ў бібліятэцы ды пра надвор'е. Падобнае можна сказаць пра кіномеханіка Малечу, бібліятэкара Лёдзю і іншых толькі названых персанажаў.

Кампазіцыйна хроніка рассыпаецца на паасобныя кавалкі, многія з якіх нічога не дадаюць да развіцця сюжэта, замаруджваюць яго. Так, напрыклад, апісваецца ядза Нікіпара на матацыкле, сцэна спаткання Аўдулі і Максіма і некаторыя іншыя.

Верш у паасобных частках паэмы ніжэй магчымасцей аўтара. Гэта асабліва выразна відаць, калі параўнаць напісаныя па-майстэрску малюнкі вечарынкі, зажынак, ліўня з такімі мясцінамі, як, напрыклад, размова Аўдулі з Коршыкам.

Думаецца, што слова «хроніка», пастаўленае на месца слова «паэма», не вызваляе аўтара ад стварэння мастацкіх вобразаў, ад роздуму над жыццём, выбару найбольш істотнага ў рэчаіснасці, нарэшце, ад неабходнасці ўвасаблення гэтага істотнага ў жывыя характары.

Хроніка — не выпадковы збор падзей, малюнкаў, партрэтаў, разважанняў. А іменна такі пералік некаторых цікавых момантаў жыцця калгаснай вёскі М. Калачынскі дае ў сваім творы. Гэта тым больш неабходна адкрыта сказаць паэту, што пад яго пяром жыццё набывае рысы ідыліі, нібы ў ім няма ніякіх канфліктаў, апроч вадэвільных.

Паэт успомніў у сваім творы такую важную падзею нашага сённяшняга жыцця, як зварот з горада ў вёску сельскіх спецыялістаў. Ён назваў такія прыкметы нашай савецкай вёскі, як радыё, кіно, бібліятэка, намякнуў нават на некаторыя непаладкі ў культрабоце ў вёсцы.

Аднак зыходзячы з таго, што ў творы названы «прыкметы часу», нельга яшчэ залічаць яго ў актуальныя. Прыкметы часу не выратоўваюць, калі падзеі жыцця падмяняюцца выпадковасцямі.

Для чаго напісаны твор? Што аўтар хацеў ім сцвердзіць? — адказаць на гэтыя пытанні немагчыма. Часопіс «Полымя», які змясціў паэму, кіраваўся непрынцыповымі крытэрыямі.

Уладзімір БОЙКА.

Міхась Калачынскі. «Дажынкі ў Каласоўцы». Лірычная хроніка. «Полымя» № 7, 1956.

Нарысы пра будаўнікоў

Здавалася-б, кніга нарысаў Пятра Валкадаева «Будаўнік» прысвечана ў значнай ступені ўчарашняму дню: дзеянне нарысаў адносіцца да пачатковага этапа будаўніцтва вялікіх гідразбудаванняў на Волзе. Але таму, што нарысы П. Валкадаева не ілюстрацыі, не фатаграфіі, пры ўсіх сваіх недахопах кніга мае цікавасць і надзённасць.

Пётр Валкадаеў добра ведае і любіць Волгу, адчувае непаўторны волжскі пейзаж, а галоўнае—разумее душу сваіх землякоў-валжан. Разам з тым нарысы звязаны з Беларуссю, многія іх героі прыехалі на вялікія будоўлі з беларускіх вёсак і гарадоў, звязалі свой лёс з гіганцкім будаўніцтвам на Волзе, аддалі свае душэўныя сілы і гарачыя сэрцы барацьбе за пераўтварэнне гэтага цудоўнага краю.

Інжынер Юрый Трыфанаў з нарыса «Сіла прыкладу», Грыша Лянэня з нарыса «Пісьмо» — сыны беларускай зямлі, і як радасна, што яны ў самых цяжкіх умовах паказваюць узоры працоўнага гераізма, што яны—адны з лепшых у калектыве будаўнікоў.

Працоўны гераізм—галоўная тэма нарысаў. Аўтар паказвае яго суровымі фарбамі, падкрэсліваючы, што гераічныя ўчынкі робяць не якіясьці цуда-волаты, а звычайныя людзі.

У гэтым сэнсе паказальныя нарысы «Падонка» і «У завею».

Сапраўдным драматызмам прасякнуты выпадак, скупа расказаны ў першым з нарысаў. У завіруху, прабіваючыся праз хмары снегу, ідуць па дарозе два «зісы». Яны вязуць металічныя трубы для зваркі трубаправодаў у Жыгулёўск, і шафёр грузавіка, што ідзе наперадзе,—Уладзімір Смалякоў не можа пакінуць груз, каб уцячы ад снежнай завеі. Ён не чакае дапамогі і ад вадзіцеля задняй машыны—Андрэя Шульгі, бо лічыць яго дрэнным сябрам. Да таго-ж Андрэй сярдзіты на Уладзіміра за праўду, якую той выказаў публічна ў адрас Андрэя. Але калі машына Смалякова праваліцца ў вялікую палонку, Андрэй Шульга, рызыкуючы жыццём, выратаваў таварыша. Ён зрабіў свой подзвіг будзённа і дзелавіта.

Аўтар тактоўна дае зразумець, што, зрабіўшы подзвіг, Шульга не перавыхаваўся ў імгненне вока, што паміж ім і Уладзімірам, магчыма, будуць яшчэ сутычкі, прынцыповыя, жорсткія спрэчкі аб адносінах да працы, да грамадскага абавязку. І ў той-жа час ясна, што душа Шульгі — душа добрага па сутнасці чалавека.

Падобная думка выказана і ў нарысе «У завею». Героя нарыса—Васіля Кулігіна выгналі з земснарада за п'янства. Праўда, хлопец п'е з гора: яму здрадзіла жонка. Але начальнік земснарада разумее, што Кулігіна патрэбна не суцяшаць, не чытаць яму мараль аб шкоднасці п'янства, а абыйсціся з ім сурова дзеля таго, каб ён «устрасянуўся». І нават тады, калі Кулігін робіць гераічны ўчынак, выратоўваючы земснарад ад цяжкай аварыі, начальнік не адмяняе свайго рашэння. Трэба даць чалавеку адчуць, што ён не мае права апускацца нават тады, калі ў яго гора.

Абодва гэтыя нарысы, як мы бачым, канфліктныя, у іх ёсць недагаворанасць, аўтар не імкнецца паставіць усе кропкі над «і». У многіх нарысах, якія з'явіліся ў апошні час, ярка выражана імкненне ўсё разжаваць, не даць чытачу магчымасці падумаць самому, разам з героямі.

І тым больш крыўдна, што аўтар не-не, ды і страціць раптам пачуццё меры, тактоўнасць. У простую размову герояў урываюцца рытарычныя выразы. Казённай мовай, узятай з дрэнных перадавіц, гаворыць, напрыклад, парторг з нарыса «Чырвоны вымпел».

Суха і паспешліва напісаны нарыс «Інжынер Белянін». Аўтар не здолеў тут раскрыць характар чалавека і сканцэнтраваў усю ўвагу на тэхнічным баку справы.

Т. ЯФІМАЎ.

П. Валкадаеў. «Строители». Дзяржаўнае выдавецтва БССР. Мінск, 1956.

ваду ў ступе, валэндайся, надрывай нервы, здароўе, пакуль яму не купяць матацыкла. А там—пляваць яму на музыку!.. Вось што, галубок, набор у нашу школу скончаны. Можаш так і сказаць тваёй мамачцы—скончаны. Па класу віяланчэлі ў нас засталося адно адзінае месца. Каго-ж загадаеш прыняць? Вось яе, гэтую малышку, якая сапраўды хоча вучыцца, ці цябе? Пэўна, і без музыкі на адных тройках паўзеш!

— Чаму на адных, ёсць і гэтыя... Каб я хацеў, дык і тата...

— А без таты не можаш?

— І яна без дзеда не магла-б...

— А гэта мы пабачым... Запрасіце сюды Сігізмунда Германавіча. Прашу падрыхтавацца.

Марфачка дастае віяланчэль, прабуе гучанне. Сакратарка ўводзіць пад руку старэнькага прафесара, асцярожліва ўсаджвае ў крэсла. Той просіць вучаніцу сесці да яго бліжэй, відаць, не давярае ўжо свайму слыху. За сталом—дырэктар, з краю стала—Мая Кірылаўна, гатовая пісаць заключэнне. Воддаль—стары Хадаркевіч, паблізу Марфачкі—Юра са сваім валейболам у руках.

— Можа, да мяне ў кабінет, Сігізмунд Германавіч?

— Не мае значэння... Ну, чым нас парадуеце, паважаная?

— «Палёт чмяля»!—падняўшыся з месца, нечакана ўрачыстым галаском абвяшчае дзяўчынка.

Стары прафесар ні то са здзіўленнем, ні то з гордасцю аглядае яе, потым спыняецца вачыма на партрэце аўтара, як-бы і яго запрашаючы ў сведкі такога смелага выкліку...

— Што-ж, паслухаем, паслухаем, Нікалай Андрэевіч,—гаворыць ён партрэту.— Паслухаем.

...І вось кволае, маленькае стварэнне — чмель ледзь-ледзь пачынае варушыць сваімі срэбранымі крылцамі. Перш чым падняцца, ён ціха гудзе пад радаснымі промнямі сонца, набіраецца цэпла, каб потым на ўсю чмяліную сілу запусціць свой рэактыўны матор—і наперакор стыхіям—прабіцца праз хмары, праз навальніцы, абляцець вакол усю планету і дасягнуць такі жаданай перамогі. Што з таго, што ён—маленькі і непрыкметны! Казачны геній даў яму сілу натхнення. Ляці-ж, мілы, ляці! У цябе тонкія крылцы, а ў Марфачкі такія-ж тонкія пальцы, але і ў іх сіла не меншая, чым у цябе. Таму і паднялі яны цудоўны скарб на такія вышыні, дзе можа лунаць толькі чалавечая радасць!

...Завершан маршрут чмяля. Але палёт яго яшчэ не скончаны. Гул яго звонкіх крыл не адразу змаўкае ў душах слухачоў. Гэта прыкметна і па паставе прафесара, і швейцара, і сакратаркі, і асабліва — дырэктара, твар якога зіхаціць урачыстасцю.

— Ну як, Сігізмунд Германавіч? Талент!

Але прафесар усё яшчэ маўчыць, апусціўшы галаву. І гэта бянтэжыць дырэктара — ці не дачасна я выскачыў са сваім заключэннем?

Адзіны, хто не траціць незалежнасці,—гэта Юра. Чаму па сутнасці здзіўляцца? Нічога тут складанага няма: вадзі смыкам, перабірай пальцамі, а махіна гэтая сама па сабе раве. Які тут асабліва сэнс? Важна, каб мацней раўла. Ніжэй націсні пальцамі—цішэй будзе раўці. Механіка не мудрая...

Паўза наша зацягваецца. Баюся, што дырэктар далей не зможа таіць свайго замяшання. Баюся, што з-за паўзы дастанецца мне і ад суфлёра, калі толькі тэатр захоча паставіць гэтую камедыю. Хіба што рэжысёр дапаможа яму, закрэсліўшы ўсе мае паўзы рашучым вечным пяром. Што-ж, у тэатры няма нічога вечнага, акрамя вечнага рэжысёрскага пяра...

Нарэшце, прафесар падымае галаву. На яго вачах... слёзы. Ён просіць дзяўчынку падысці бліжэй. Гладзіць яе па галаве.

— Дзякуй табе. Гэта была шчаслівая хвіліна...

Напружанасць спадае ў адно імгненне. Дырэктар плешча ў далоні. Расчулены Хадаркевіч з гордасцю тлумачыць прафесару:

— Унучка мая... Марфачка...

Старога вітаюць і дырэктар, і сакратарка. Марфачка зэле шчасцем. Гэта першы трыумф у яе жыцці. Успомніўшы пра сваю ўладу, дырэктар загадвае сакратарцы:

— Пішыце: залічыць па класу Сігізмунда Германавіча.

Пра юнага валейбаліста ўсе нібы забыліся. Але парадак існуе не толькі дзеля парадку, а і дзеля формы.

— Ну, галубок, што-ж вы нам скажаце? Вось вам і чмель, а? — пацяшаецца дырэктар.

— Падумаеш, птушку выкапалі — чмяля нейкага. Я магу гэтага... што адной лапай чалавека забіваю. Як дасць, дык ты і гатоў... Страус!..

Наўрад ці калі гучала тут, пад партрэтам вялікага Корсакава, такая абраза музыцы.

— М-малады чалавек...— вымаўляе прафесар, — якое мае дачыненне да музыкі гэты... гэты ваш страус са сваімі лапамі?

— Як якое? — не менш здзіўлены і знаўца птушак. — А вальс страуса?

Можна, вядома, пасмяяцца. Кожнаму, як хто хоча і як хто ўмее, дазваляецца адводзіць сваю душу. Але ці варта крыўдзіцца і, тым больш, абурацца? Хлопец трапіў сюды з непаразумення. І ўраставаца ад гэтага аболтуса наўрад ці можна лёгкім жартам. Трэба яго канчаткова асарамаціць.

— Ёсць прапанова паслухаць страуса! — важна абвяшчае дырэктар. — Сігізмунд Германавіч, — адну хвілінку цярпення... Прашу вас, малады чалавек... Дазволь яму, Марфачка, віяланчэль...

Прафесар, які гатоў быў ісці, безнадзейна махае рукой і зноў садзіцца ў сваё крэсла. Такіх музыкантаў яму яшчэ не даводзілася экзаменаваць.

Хлапчына займае тое-ж месца, на якім кагадзе сядаела шчаслівая Марфачка, ставіць перад сабой інструмент і бярэ смык. Сапраўды, гэта рухі ўпэўненага чалавека. Але што сталася з тым смыкам, з тымі струнамі, якія толькі што перадавалі нам усе гукавыя адценні радаснага чмялінага палёту! Калі чулі вы, як нажоўкай пілуюць жалеза, калі чулі вы, як забіваюць цвікі ў бляшаны дах — гэта будзе толькі прыблізнае сугучча з той музыкай, якую адважна высякаў з інструменту сваімі бязлітаснымі ўдарамі юны асілак.

— Даволі! — закрываючы вушы, патрабуе прафесар. — Даволі!

— Скажы, галубок, ты першы раз іграеш?..—дамагаецца да канца абяззброіць упартага назолу дырэктар.

— Мама хоча, каб я на скрыпцы... А я не хачу. Якая гэта іграа: ці-лі, ці-лі. Скажу, каб і мне купіла такую...

— А не цяжка табе будзе? — падкрадваецца дырэктар да наіўнай душы.

— А машына дзеля чаго? Арцём будзе вазіць.

— Якая машына?

— А вунь, — паказвае ў акно Юра і без асаблівай цырымоніі крычыць на вуліцу:

— Арцём! Парадак! Хутка будзе мне амбец. Законны! Што? Скора паедзем!

Дырэктар, падышоўшы да акна і зірнуўшы ўніз, нечакана пачынае як-бы асядаць на падлогу. І калі ён паварочваецца тварам, мы бачым — здарылася штосьці жахлівае. Чалавек увесь спалатнеў, яму занялі мову:

— Госпадзі, божа мой... Гэта-ж «ЗІМ» Самсона Палікарпавіча... Самога... Значыць, вы сын... Што-ж вы, дарагі мой... Сігізмунд Германавіч, гэта-ж яны — сын Самсона Палікарпавіча!..

Стары прафесар рашуча адмахваецца рукой:

— Толькі не па майму, толькі не па майму класу. Куды хочаце — туды і прымайце: па раялю, па скрыпцы, па духавых... а можа, па ўдарнай групе пойдзеце, малады чалавек, — па барабану?

— Не, я хачу па гэтай... па каланчэлі...

— Дарафей Панцялеевіч! — не вытрымлівае прафесар. — Гэта знявага, гэта здзек! Я здымаю з сябе адказнасць...

— Дарагі Сігізмунд Германавіч! Адказнасць ляжала і ляжыць на мне. Вы адказваеце за адзін клас, а я — за ўсе класы! Мая Кірылаўна, афармляйце: залічыць па класу прафесара Блата...

— Хто з нас, нарэшце, прафесар, хто з нас Блат — я ці вы? — Гэта апошні выбух абурэння прафесара. І ён выходзіць з прыёмнай.

— Афармляйце, Мая Кірылаўна... Ну, віншую вас, ад усяе душы віншую, Юры Самсонавіч.

— А я? — нясмела вымаўляе дзяўчынка.

— Як-жа з Марфачкай, Дарафей Панцялеевіч? — трывожыцца і Хадаркевіч.

— Дарагі мой, — супакойвае дырэктар, — ты чалавек свой і павінен разумець. Ёй яшчэ годзік-два трэба пасядзець дома, выпрацаваць, так сказаць, тэхніку, так, так, тэхніку, а там — калі ласка, у першую чаргу...

Чуласць дырэктара асабліва прыкметна па тым, як ён ласкава абнімае за плечы Хадаркевіча, гладзіць па галаве Марфачку і праводзіць іх да парога. Сакратарка выходзіць у кабінет.

— Яшчэ раз вітаю, Юры Самсонавіч...— трасе ён руку толькі што адкрытага ім таленту. І радасць гэтага адкрыцця зэле на ўсім яго абліччы. — Самсон Палікарпавіч будзе рад...

— Сабантуй мне будзе.

— Як вы сказалі?

— Дасць ён чосу, калі дазнаецца.

— Дазвольце, хіба-ж Самсон Палікарпавіч супраць, каб вы вучыліся ў музычнай школе?

— Ён яшчэ за тую, немузычную, дзе я вучуся, ніяк не можа даравацъ. Кажа, я яшчэ спушчу з цябе шкуру.

— Прабачце, за што-ж?

— Я нашаму дырэктару чарнільніцу за каўнер выліў.

Твар Дарафея Панцялеевіча перасмыкнуўся грымасай невядомага прызначэння.

— Ха-ха-ха! Ну і дадумаліся. За каўнер, кажаце, чарнільніцу? Бр-р!.. Не вельмі, відаць, прыёмна. А ўрэшце глупства.

— Са школы былі выключылі.

— Ну, вядома, вядома. Знойдуцца гарладзёры. Яны табе з мухі слана зробяць. Знарок будуць усюды крычаць: сынок самога Самсона Палікарпавіча, сынок Самсона Палікарпавіча! А дзеля чаго? Дзеля кампраметацыі. Дарагі Юры Самсонавіч, я не з такіх, хто пры дапамозе крытыкі знізу сам хоча вылезці наверх. Калі я і ў нізах буду па-сапраўднаму, па-прынцыповаму аддаваць усе свае сілы, дык і ў вярхах мяне заўважаць. Перадайце Самсону Палікарпавічу, што я аддам усе сілы. І тое, што вы, Юры Самсонавіч, будзеце вучыцца ў нашай школе— гэта, асабіста для мяне вялікая радасць. Я не пашкадую ні часу, ні здароўя, каб раскрыць ваш талент!

А тым часам, будучы талент, можа таму, што яшчэ не раскрыты і не спешчаны славай, з узвышаных прызнанняў дырэктара толькі і зразумеў, што яму тут сапраўды можна ва ўсю разгарнуць сваю творчую фантазію.

Ляскаць далоняй па мячы, а потым качаць яго патроху нагой па прыёмнай, пакуль дырэктар гаварыў сваю прамову, нарэшце, надакучыла яму. І светлая думка азарыла яго твар:

— Давай папасуемся.

— Як гэта, Юры Самсонавіч?

— А вось як: хэп-хэп, гоп-гоп! Так, так. Весялей! Э-э, ды не лавіце вы варон!.. Няўжо не бачыце, што мяч над сталом.

Слабасць, слабасць чалавечая! Чаго не зробіш у імя адданасці і любві да вышэйстаячага над табой начальніка. Палезеш, вядома, і пад стол... Музычны дырэктар, які поўгадзіны таму назад не мог адрозніць футбола ад валейбола, настолькі захапіўся гульнёй, што не заўважыў, як адчыніліся дзверы і ў парозе, як укапаны, спыніўся стары Хадаркевіч.

— Таварыш дырэктар! — у немым здзіўленні ўсклікнуў ён, убачыўшы, як Дарафей Панцялеевіч з мячом у руках вылазіць з-пад стала. — Што з вамі? — і, павярнуўшыся да новага вучня, сказаў:

— Хлопчык, ідзі ты дадому. Дарафею Панцялеевічу трэба адпачыць...

— А-а-а! — скачучы на адной назе, крычыць пераможца. — Трынаццаць і пяцьдзесят сем у маю карысць! — і знікае за дзвярыма.

— Дарафей Панцялеевіч! Таварыш дырэктар! — толькі і вымавіў Хадаркевіч і ўзяўся наводзіць парадак у прыёмнай... Але якім горкім дакорам аддаліся ў спусцелым пакоі гэтыя словы...

Абхапіўшы аберуч галаву, дырэктар сядзіць за сталом. Напружанае маўчанне доўга панае ў прыёмнай. І раптам спакваля, невядома нават адкуль, у нацятую ціцьцыню пачынае ўпарта прабівацца тонкі, працяжны, знаёмы нам гул... Не можа быць сумнення, гэта — чмель! Але не той радасны і ўрачысты, якога кагадзе ўсе віталі ў гэтым пакоі, — не. Гэта хутчэй нейкія дзікія варыяцыі на знаёмую тэму. Пранізлівы, працінаючы навылёт душу, чмяліны гуд

(Заканчэнне на 4-й стар.).

Словы і справы

1.

Народ склаў багата прымавак і паторак, якія нібы папярэджваюць, засцерагаюць тых, хто не паважае, хто пагардліва ставіцца да слова: «не жартуй словам», «слова—закон», «не па словах мяркуюць пра чалавека, а па яго справах».

Між тым як часта сустракаюцца ў нашым жыцці не ў меру прыткія людзі, якія любяць з высокай трыбуны сходу або, скажам, нарады ўзяць абавязацельства і з выглядам пераможцы пад апладысменты прысутных заняць месца ў прэзідыуме. І вераць яны ў рэальнасць сваіх слоў, відаць, толькі тады, калі гаворацьь, а пасля—хоць трава не расці.

Штосьці падобнае адбылося ў Столінскім раёне Брэсцкай вобласці.

...Сход быў бурным. Выступалі нават тыя, хто ніколі і слова не сказаў перад грамадой. Найбольш актыўнымі былі комсамольцы і маладыя калгаснікі. Ды якжа інакш? Абмяркоўваецца пытанне, якое іх моцна хвалюе: што трэба зрабіць, каб палепшыць культурна-масавую работу ў вёсцы, каб у хаце-чытальні заўсёды было чыста і ўтульна, каб можна было тут цікава і змястоўна адпачыць. Прэзідыум сходу ледзь паспяваў занатоўваць прапановы, што паступалі ад калгаснікаў.

— Трэба, каб самадзейныя гурткі добра працавалі, і ў першую чаргу драматычны і харавы,—чуецца звонкі дзявочы голас.

— Да якога часу танцораў будзеце трымаць у чорным целе, і ім трэба разгон...

У зале чуецца дружны, вясёлы смех.

У той вечар гаварылі і пра лекцыі і канцэрты, і пра выпуск насценнай газеты, і пра тое, што мала навінак ёсць у бібліятэцы. А нехта нават прапанаваў запрасіць у калгас артыстаў з Мінска. Няхай, маўляў, пакажуць сваё майстэрства і павучаць калгасных артыстаў, ды скажуць, чаго яны варты.

І вось 13 сакавіка 1955 года ў раённай газеце «Ленінскі шлях» былі надрукаваны «Абавязацельствы калгаснага актыву, партыйнай і комсамольскай арганізацый, інтэлігенцыі і маладых калгаснікаў сельгасарцелі імя Калініна»:

«...Абмеркаваўшы стан масава-палітычнай і культурна-асветнай работы сярод насельніцтва нашага калгаса, бярэм на сябе наступныя абавязацельствы:

Не пазней сёмага лістапада 1955 года закончыць будаўніцтва тыцавога калгаснага клуба. Будаўніцтва правесці сіламі калгаснікаў; не менш чатырох-пяці разоў у месяц выступаць перад насельніцтвам з чыткай лекцый і дакладаў у брыгадах, жывёлагадоўчых фермах і ў хаце-чытальні; узмацніць і пашырыць харавы і драматычны гурткі мастацкай самадзейнасці; стварыць дадаткова танцавальны гурток; пашырыць калгасную бібліятэку на тысячу рублёў».

Заканчвалася гэтае абавязацельства словамі, да якіх нельга было паставіцца абыякава: «Звяртаемся да ўсіх партыйных і комсамольскіх арганізацый, да ўсіх сельскіх саветаў і праўленняў калгасаў, да ўсёй сельскай інтэлігенцыі з заклікам паследаваць нашаму прыкладу і ўключыцца ў соцыялістычнае спаборніцтва за рэзкае паляпшэнне масава-палітычнай і культурна-асветнай работы».

Па даручэнню сходу абавязацельства падпісалі: старшыня калгаса імя Калініна І. Чэкан, сакратар партыйнай арганізацыі І. Арцёменка, старшыня сельсавета М. Мацвяйчук, дырэктар школы В. Данчанка і іншыя.

І зашумела, загуло. Ва ўсіх калгасах раёна адбываліся многалюдныя сходы, на якіх горача абмяркоўваўся заклік калінінцаў, уносіліся прапановы і дадаткі. Пра высокародны пачын працоўных Столінскага раёна загаварылі па ўсёй Беларусі, у Міністэрстве культуры, пра іх цікавыя справы пісалі рэспубліканскія і абласныя газеты.

Сапраўды, у раёне ў мінулым годзе значна ажывілася культурна-масавая работа. А Малькавіцкая хата-чытальня, Рачыцкі і Плотніцкі сельскія дамы культуры сталі асабліва папулярнымі сярод калгаснікаў. А як-жа ініцыятары спаборніцтва? І яны варушыліся. Дырэктар школы В. Данчанка ўзначаліў сельскі лекторый. Настаўнікі і спецыялісты сельскай гаспадаркі чыталі калгаснікам цікавыя лекцыі, ажывілася работа самадзейных гурткоў. Наладжваліся канцэрты, цікавыя вечары. Справу можна было паставіць яшчэ лепш. Але ўсю работу пачало затрымліваць памяшканне. Рухчанская хата-чытальня займае невялікі пакой. У ім не разгоніцца. Прыдзе чалавек дваццаць-трыццаць—і дыхнуць нельга.

Вырашылі будаваць клуб з саману, так лагчэй і хутчэй. Калгас набыў нават конную глінамяшалку для вырабу саманных пліт і розныя будаўнічыя матэрыялы, а недахопу ў рабочай сіле не было. Моладзь ледзь не кожны дзень прыходзіла да старшыні калгаса тав. Чэкана з адным пытаннем: «Калі пачнем будаваць?»

— Праз тыдзень, праз два,—чулася ў адказ,—вось толькі крыху ўправімся з першачарговымі работамі...

Мінулі тыдні, месяцы. Надыйшло свята Кастрычніка, а клуба ў Рухчы як не было, так і няма. Апусціліся рукі ў моладзі. Наладжаная з такімі пяжкасцямі работа зноў занепала. У 1956 годзе будаваць клуб калінінцы так і не пачыналі.

2.

З канца ў канец вёска. Беражное цягнецца ледзь не на пяць кіламетраў. Паабапал шырокай, нібы праспект, вуліцы стаіць многа новых дамоў калгаснікаў. У гэтай вялікай і прыгожай вёсцы больш за 800 двароў і ледзь не кожны мае садок. Вясной Беражное тоне ў тонкім духмяным водары кветак.

Заможна жывуць тут калгаснікі. Толькі ў мінулым годзе калгас імя Леніна атрымаў прыбытку чатыры з палавінаю мільёна рублёў, а сёлета справы ідуць значна лепш.

Ганарацца беражноўцы сваёй новай прыгожай сярэдняй школай. У новым доме з калонамі размясцілася праўленне калгаса. Ззяе белізной новы сельмаг. У вёсцы працуюць тры магазіны, чайная, аптэка, фельдчарска-акушэрскі ўчастак, пошта, ёсць радыё. Чым не горад? Толькі дарэмна будзеце шукаць у Беражным клуба. Яго тут няма.

Пад саламянай страхой стаіць невялічкая хаціна. Днём адзін за адным ідуць сюды вучні, беражна несучы ў руках кнігі. Яны і скажуць, што тут знайшла прытулак Беражноўская хата-чытальня. І хоць у ёй утульна і чыста, але яна ніяк не можа задаволіць калгаснікаў. Вельмі дзіўна, што ў лепшым у раёне калгасе-мільянеры, за гонарам якога так пільна сочыць старшыня сельгасарцелі Іван Акімавіч Клінаў, хата-чытальня размясцілася ў звычайнай маленькай сялянскай хаціне, якіх у вёсцы засталося не так ужо і многа.

У чым справа? Чаму раптам такая беднасць, калі пытанне датычыць культурнага адпачынку калгаснікаў? Кіно звычайна ставіцца ў школе, у адным з класаў. Гэта нязручна і калгаснікам, цярпяць ад гэтага і вучні. Ну, а лекцыі, канцэрты дзе праводзяць? Зноў-жа школа, выручае праўленне. Зімой калгаснікі пазбаўлены магчымасці праводзіць вольныя вечары ў хаце-чытальні, бо яна можа змясціць не больш дваццаці чалавек.

Неаднаразова Іван Акімавіч Клінаў даваў абяцанні распачаць будаўніцтва клуба, «каб і ў раённым цэнтры пазайздросцілі». Ішла аб гэтым гаворка ў мінулым годзе. Адклалі на 1956 год. А сёлета вырашылі заняцца будаўніцтвам у 1957 годзе.

Між тым вопыт перадавых калгасаў рэспублікі, такіх, як «Рассвет», «Камінтэрн» Магілёўскай вобласці, паказвае, што практычна магчыма такое спалучэнне, калі адначасова няўхільна ўмацоўваюцца ўсе галіны грамадскай гаспадаркі і тутжа побач ідзе будаўніцтва клуба. У Беларусі ёсць сотні калгасаў, якія маюць сёння добраўпарадкаваныя новыя клубы, духавыя аркестры і г. д.

Прычына тут, вядома, не ў адсутнасці сродкаў. Іх пры жаданні можа адшукаць калгас імя Леніна. Справа ў кансерватызме, які жыве яшчэ ў сэрцах некаторых важакоў калгаснай вёскі, у няправільным стаўленні і разуменні імі культуры, як нейкай другараднай, пабочнай справы.

Нельга забываць, што сёння культурнамасавая работа ў вёсцы набывае асабліва шырокі і глыбокі сэнс. Да гэтага абавязваюць нас гістарычныя рашэнні XX з'езду Компартыі Савецкага Саюза. Сёння культура—гэта нябачаныя раней ураджаі, гэта высокія надоі малака, гэта кнігі, газеты, кіно, радыё, клуб, гэта і лазня і электрычнасць у вёсцы. Які размах, шырыня! Ёсць над чым падумаць працавітым калгаснікам з Беражнога. Не адным-жа хлебам сыты чалавек.

Варта сказаць і аб некаторых сузіральных адносінах да пытання культурнага будаўніцтва ў вёсцы з боку мясцовых партыйных і савецкіх арганізацый. Калі-б, скажам, старшыня Столінскага райвыканкома тав. Луфераў не ад выпадку да выпадку, не на пасяджэннях выканкома цікавіўся работай культасветустаноў, а штодзённа, не выпускаючы яе з поля зроку ні на хвіліну, тады цяжка было-б не выканаць дадзенае слова і тав. Клінаву, і тав. Чэкану, і многім іншым аматарам прыгожых і гучных абавязацельстваў.

Важна, каб культурным будаўніцтвам у вёсцы сур'ёзна займаліся і аддзелы культуры, каб яны не збіралі зводкі, колькі самадзейных гурткоў працуе, а самі былі-б у цэнтры падзей, глыбока ўнікалі ў сутнасць справы і ведалі, што галоўнае на дадзеным этапе. У аддзелаў культуры яшчэ мала самастойнасці і смеласці пры вырашэнні таго ці іншага пытання. Яны празмерна часта звяртаюцца за дапамогай, і гэтая апека перашкаджае ім самастойна вырашаць многія пытанні. Трэба, скажам, пабяліць памяшканне клуба. Чаму абавязкова гэта неабходна «узгадняць» з райвыканкомам або райкомам партыі? Падобная практыка толькі прытупляе ініцыятыву ў рабоце, зніжае адказнасць за даручаную справу.

3.

Набліжаюцца халодныя асенніх вечары, а там не за гарамі і зіма. У Столінскім раёне падрыхтоўка культасветустаноў да зімы фактычна не пачыналася. Загадчык аддзела культуры тав. Мардусевіч не мае плана рамонтных работ у культасветустановах. Для яго, напрыклад, вялікай нечаканасцю было тое, што памяшканне Плотніцкага сельскага дома культуры пад нагрозай абвалу, што і ў Белавушскім сельскім клубе невядома калі справы пойдуць на лад.

У мінулым годзе калінінцы ўзварушылі грамадскасць раёна. Гэта дало свае плённыя вынікі. А сёлета пра культасветустановы забыліся ўсе. У раёне працуе 11 сельскіх бібліятэк, з іх 8 знаходзяцца ў найманых памяшканнях. Чатыры хаты-чытальні таксама арандуюць пакоі ў калгаснікаў. Некалькі культасветустаноў раёна знаходзяцца ў адным памяшканні з выканкомам сельсавета. Гэта зноў невялічкі пакойчык, дзе можна паставіць толькі шафу для кніг, стол і пару лавак.

У гэтых умовах асабліва важнае значэнне набывае будаўніцтва калгасных клубаў. У сельгасарцелях імя Маленкова, імя Сталіна, «Першае мая», імя Молатава (Столінскага горсовета) разгарнулася будаўніцтва клубаў. Па тыпавому праекту будуюць молатаўцы клуб. Тут будуць і файа, і добрая глядзельная зала, і пакоі для гуртковай работы. З першых крокаў сваёй работы трыццацітысячнік тав. Музялееў—старшыня сельгасарцелі «Першае мая»—пачаў клапаціцца пра клуб. І вось ужо завезены ўсе матэрыялы, і за справу горача ўзяліся самі калгаснікі, хоць яны пакуль што і не мільянеры.

Да зімовых халадоў трэба добраўпарадкаваць усе ўстановы культуры раёна. І тут па дапамогу павінны прыйсці ў першую чаргу сельскія саветы, партыйныя і комсамольскія арганізацыі, калгаснікі і інтэлігенцыя. Справу трэба арганізаваць так, каб узятыя ў мінулым годзе абавязацельствы сёлета былі абавязкова выкананы.

Я. ДАНСКАЯ.

Да стагоддзя з дня нараджэння Івана Франка

У Кіеўскай кіностудыі

Да знамянальнай даты—юбілею Івана Франка—засталося менш месяца. Украіна рыхтуецца ўрачыста адзначыць гэты дзень. Кіеўская студыя навукова-папулярных фільмаў заканчвае здымкі каляровага фільма-манаграфіі «Іван Франко». (Сцэнарый Л. Остроўскага і А. Мароза, навуковы кансультант Д. Капіца).

На плёнку знята ўжо многа сцэн і кадраў. Сярод іх рэволюцыйныя выступленні львоўскіх рабочых у 1905 годзе, сход выбаршчыкаў, якія вылучалі кандыдатуру Франка ў аўстрыйскі парламент, сустрэча пісьменніка пасля выхаду з турмы з сябрамі і працоўнымі Львова, удзел яго ў рабоце нелегальных гурткоў і інш.

Ролю Франка выконвае народны артыст СССР Сяргей Бандарчук. Здымае фільм аператар Кульчыцкі, музыку напісалі кампазітары Б. Ляташынскі і М. Колеса.

Натурныя здымкі праводзіліся ў Львове, Драгобычы, Барыславе, Каломне, на Чарамошы. Цяпер экспедыцыя Кіеўскай кіностудыі знаходзіцца на радзіме Івана Франка ў Драгобыцкай вобласці.

„Слова аб вялікім Каменяры"

Дзяржаўнае выдавецтва мастацкай літаратуры Украінскай ССР выпусціла ў свет зборнік артыкулаў «Слова аб вялікім Каменяры». У яго ўвайшлі артыкулы совецкіх літаратуразнаўцаў, фалькларыстаў, тэатразнаўцаў.

У першым томе зборніка надрукаваны артыкулы П. Тычыны — «Бессмяротнае слова Каменяра», А. Кісялёва — «Паэтычная творчасць І. Франка», А. Бялецкага — «Мастацкая проза І. Франка», «Франко і індыйская літаратура», П. Кісялёва — «Драматургія І. Франка», І. Баса — «Іван Франко і рускі вызваленчы рух» і інш. У другім томе змешчаны артыкулы М. Рыльскага — «Франко — паэт», М. Войзніка—«Франко, як даследчык і гісторык украінскай літаратуры» і інш.

Майстэрства гасцей

Гастролі артыстаў нямецкага цырка ў Мінску

З вялікім поспехам прайшлі выступленні артыстаў совецкага цырка ў Заходняй Еўропе. Гледачы сустрэлі нашых акрабатаў, эквілібрыстаў, жанглёраў і дрэсіроўшчыкаў з выключным захапленнем. Друк Францыі, Бельгіі і іншых краін пісаў аб арыгінальнасці пастановачных замыслаў, таленавітай рэжысуры, рознастайнасці жанраў, майстэрстве выканання ўсіх нумароў, аб добрым гусце і высокай творчай культуры совецкага цырка.

Нібы ў адказ на гэтыя гастролі цяпер у Мінск прыехалі майстры нямецкага цырка.

Выступленні артыстаў Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі і Федэратыўнай Рэспублікі Германіі даюць магчымасць жыхарам сталіцы Совецкай Беларусі пазнаёміцца са здабыткамі гасцей у гэтай галіне мастацтва. Госці знайшлі ў Мінску прыхільнага і патрабавальнага гледача і хутка ўстанавілі з ім творчы кантакт.

Прыемнае ўражанне пакідаюць высокі прафесіяналізм нямецкіх артыстаў, бездакорная тэхніка выканання многіх трукаў, дынамічнасць і імклівы тэмп паказу, багатае афармленне многіх нумароў.

Не ўсе жанры прадстаўлены на манежы. Няма тут майстроў слова — сатырыкаў, эквілібрыстаў на дроце, прафесійнага дывановага клоуна, які сваімі жартамі звычайна еднае ўсю праграму. Толькі адным нумарам прадстаўлена дрэсіроўка (дрэсіраваныя сабакі Тіл-Шумана). Аднак і без гэтага праграма паказу даволі рознастайная і цікавая, хоць і дамінуе ў ёй пераважна акрабатычны жанр.

Акрабатыка займае настолькі значнае месца ў мастацтве нямецкіх артыстаў, што яе элементы ёсць ва ўсіх нумарах, у тым ліку нават і ў выступленнях музычных эксцэнтрыкаў (артысты Хайдэр).

Вельмі цёпла і прыхільна былі сустрэты партэрныя акрабаты (каскадзёры) Хорціна.

Мяккасць іх выканання сплучаецца з сапраўды бліскучым рытмам. Хорціна вельмі «вясёлыя» артысты, для якіх няма нічога непераадольнага, ніякіх цяжкасцей. Самыя складаныя практыкаванні, якія патрабуюць найвялікшага фізічнага напружання, робяцца імі з надзвычайным спрытам і лёгкасцю. Гэтымі-ж якасцямі вызначаецца і мастацтва вальтыжораў (на руках) Моніс.

Бездакорную тэхніку, зграбнасць, смеласць і мужнасць прадэманстравалі паветраныя гімнасты дэ Коста. Пад купалам цырка яны адчуваюць сябе свабодна, як у роднай стыхіі.

Аб сапраўдным прафесіяналізме, фізічнай загартаванасці і выдатнай трэніроўцы замежных майстроў сведчаць таксама практыкаванні і трукі эквілібрыстаў на лесвіцы Аркус, жанглёраў Гардзі і Грытана, веласіпедыстаў-віртуозаў Граланда, артыстаў Гройхер. Пачуццё гумару ўласціва выступленням акрабатаў-комікаў Артур.

Ікарыйскія гульні добра вядомы совецкаму гледачу па шматлікіх выступленнях нашых артыстаў. Нямецкі жаночы калектыў пад кіраўніцтвам Мальвіда таксама прадэманстраваў гульні ў імклівым тэмпе, з сапраўднай гарэзлівасцю, мякка і з добрым густам.

Дасціпна і тэхнічна бездакорна выступае на манежы ілюзіяніст з цыгарай Луперці.

Удала дапаўняюць паказ спрытныя фехтавальшчыкі Менза, скакуны Лупі, флегматычныя комікі Піф-Паф і Тоніто, якія запаўняюць паўзы паміж асобнымі нумарамі і самастойна ўдзельнічаюць у праграме.

Аднак з усёй цікавай праграмы гасцей асаблівае захапленне аматараў цырка выклікае дасканалае, віртуознае мастацтва эквілібрыста Марко. Гранічнае пачуццё балансу, выдатная спартыўная форма, спакойнае і ўпэўненае майстэрства забяспечваюць яму дакладную, нават зграбную падачу небяспечнага нумара з кінжаламі на неўмацаванай лесвіцы.

У добрым успрыняцці паказу ёсць заслуга і аркестра пад кіраўніцтвам дырыжора Кёніха.

Прыезд артыстаў нямецкага цырка ў Мінск спрыяе ўмацаванню культурных сувязей паміж нашымі народамі.

Н. АЛЯКСЕЕУ.

На здымку: віртуозы на веласіпедах — артысты Граланда.

Фото І. Салавейчыка.

ДРУЖБА БРАТНІХ НАРОДАЎ

Растуць і ўмацоўваюцца культурныя і дзелавыя сувязі паміж Совецкай Беларуссю і Карэйскай Народна-Дэмакратычнай Рэспублікай. На заводах і фабрыках КНДР добра зарэкамендавалі сябе станкі з маркамі заводаў Беларусі; на палях Карэі часта можна сустрэць трактар «Беларусь». Дэлегацыі з далёкай Карэі прыязджаюць у нашу рэспубліку вывучаць вопыт перадавікоў прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Шырока вядомы карэйскім сялянам брашуры «Наш калгас» (аб калгасе «Барацьба» Рудзенскага раёна Мінскай вобласці) і «Калгас «Рассвет», па якіх яны вучацца перадавым метадам вядзення сельскай гаспадаркі.

Многія творы карэйскіх пісьменнікаў перакладзены на беларускую мову. У той час карэйскі народ чытае ў перакладзе на сваю родную мову творы Я. Купалы, Я. Коласа, М. Танка і іншых беларускіх пісьменнікаў. З вялікім поспехам выступаў у Мінску Ансамбль песні і танца карэйскай Народнай арміі. Цёпла сустракалі комсамольцы Беларусі карэйскую маладзёжную дэлегацыю. Зусім нядаўна ў Беларусі гасціла дэлегацыя карэйскіх журналістаў.

Дружба братніх народаў знайшла яркае ўвасабленне і ў перапісцы паміж рознымі арганізацыямі і асобнымі грамадзянамі. Не так даўно комсамольцы і маладыя рабочыя мінскага завода імя Кірава атрымалі пісьмо ад калектыву маладзёжнага цэха Пхен'янскага завода тэкстыльных машын, у якім карэйскія сябры дзякуюць беларускім машынабудаўнікам за вырабленыя для іх станкі. Яны паведамляюць, што гэтыя машыны дапамаглі ім узняць прадукцыйнасць працы у 5—7 разоў.

Устанавілася перапіска паміж мінскімі трактараводцамі і калектывам Чонпхёнскай дзяржаўнай машынна-трактарнай станцыі правінцыі Поўднёвы Хамгён, на палях якой працуюць трактары «Беларусь». Больш 20 пісем з Карэі атрымана ў калгасе «Рассвет». З карэйскімі сябрамі перапісваюцца рабочыя Барысаўскага лесапрамгаса, калектыў Магілёўскай абласной канторы Сельгасбанка, мінскага медыцынскага вучылішча № 2, мінскай школы № 1 і многія іншыя.

Для карэйскіх сяброў гасцінна адчыніліся дзверы многіх вышэйшых навучальных устаноў нашай краіны. Толькі ў мінулым годзе ў аспірантуры, інстытутах і тэхнікумах Совецкага Саюза, Кітайскай Народнай Рэспублікі і ў краінах народнай дэмакратыі вучылася пяць тысяч карэйскіх студэнтаў.

Актыўным творчым жыццём жывуць карэйскія літаратары. У мінулым годзе 60 пісьменнікаў накіраваліся ў доўгатэрміновую камандзіроўку на заводы і фабрыкі, у вёскі, следуючы закліку партыі — быць бліжэй да жыцця, да народа. Многія з іх працуюць рэдактарамі за водскіх газет, загадваюць хатамі - чытальнямі.

За апошняе дзесяцігоддзе пісьменнікі КНДР напісалі новыя творы, прысвечаныя барацьбе свайго народа за свабоду і незалежнасць, мірнаму ўз'еднанню Карэі і дружбе народаў.

За гады народнай улады ў краіне расквітнела новая маладая культура. Створаны Дзяржаўны мастацкі тэатр, балетная школа, Дзяржаўны тэатр класічнага мастацтва. Ансамбль песні і танца карэйскай Народнай арміі, Мастацкі тэатр Міністэрства чыгункі, сімфанічны аркестр. У Хамхыне, Кэсоне і іншых гарадах адкрыты правінцыяльныя тэатры. Упершыню ў гісторыі краіны створана вышэйшая музычная навучальная установа — кансерваторыя. У сучасны момант тут займаецца 600 кампазітараў, музыкантаў-выканаўцаў, вакалістаў. Многія выкладчыкі кансерваторыі атрымалі музычную асвету ў Совецкім Саюзе.

В. АНТОШЫН.



На здымку: Дзяржаўны мастацкі тэатр у Пхен'яне.

Палёт чмяля

(Заканчэнне)

усё мацнее. То трымціць на адной высокай неадчэпнай ноце, то раптам зрываецца і ляціць у прорву. А можа гэта ў мяне ў галаве? Не, вось і стары Хадаркевіч прыпыняе работу і як-бы пачынае прыслухоўвацца.

— Гэта ў мяне ў вушах, ці і вы чуеце?—пытаецца дырэктар.

— Чаму-ж, чую.

— Гудзе?

— Гудзе.

— Дарагі Сідар Пятровіч, зразумейце,— я не вінаваты... Сітуацыя...

— Ат, мне ўжо ўсё роўна. Я больш не змагу служыць у вас. Брыдка.

— Сідар Пятровіч, а мне, думаеце, не моташна?... Сапраўды, стаміўся я. А тут яшчэ гэты... чуеце? Проста мазгі свідруе... Во-во-во! — і дырэктар нецярпліва ўзмахвае каля вуха рукой.

Хадаркевіч здзіўлена і крыху спалохана пачынае сачыць за нечаканымі рухамі дырэктара. Хіба ў галаве ў яго што зрушылася? Вось ужо абодвума рукамі ён пачынае адмахвацца з усіх бакоў. Усхоплівацца з месца. Ходзіць па пакоі — і ўсё прыслухоўваецца. Потым трывожны пагляд яго пачынае блукаць па сценах, па кутах, па падлозе...

— Гудзе, Сідар Пятровіч?

— Гудзе.

— Што-ж яно за стварэнне?..

— Хто?

— Ды чмель: ж-ж-ж, з-з-з!

— А-а-а!.. Заварушыўся ён такі ў тваёй душы! — вымаўляе ў неспадзяванай радасці сам сабе Хадаркевіч. — Сумленне і цябе точыць... Ды стварэнне гэтае, Дарафей Панцялеевіч, для таго, хто яго не бачыў...

— А што яно — пчала?

— Як даць вам зразумець. Ну вось, як скажам, віяланчэль — скрыпка над скрыпкамі, гэтак ён — пчала над усімі пчоламі. Во — з кулак. Рыжы, калматы, а лапы — во!

— Кусаецца?

— Не дай божа. Джала-ж у палец. Калі джгне—то і канец. І ніякага ратунку.

З пільнай і трывожнай насцярогай дырэктар сочыць за кожным рухам рукі Хадаркевіча. Неадчэпнае, нясцерпнае гудзенне ўсё нарастае. Цяпер ужо бясспрэчна, што чмель тут, блізка. Чуваць, як ён аж заходзіцца ад глухога гулу. Дзе-ж ён, дзе? Ага, я ўжо бачу — дзе: у кулаку старога Хадаркевіча.

— Не выпускайце яго! Не выпускайце!

— Не ў маёй гэта ўжо волі, таварыш дырэктар. Ганяўся ты за мячыкам, паганяйся цяпер за чмялём!

Хадаркевіч раскрывае кулак — і ўрачыстая радасць выпушчанага на свабоду нявольніка запаўняе ўсё навакол.

Дырэктар кідаецца да тэлефона. Што такое? І ў трубцы — чмель! Ён ужо не гудзе, а раве. Сіганўўшы паўз самае вуха, цяпер ён ужо кружыць пад столлю. А-а! Нарэшце! Папаўся! Завяз, як у павуціне, у каўпаку люстры. Трэба за раз-жа падцягнуць стол, узлезці на яго і захапіць зянацку, задушыць калматую пачвару! З каўпака сыплецца густы пыл...

Малюнкі мастака **А. ГОЛУБЕВА.**

— Не ўцячэш!.. Дабяруся я да цябе... Задушу.

— Трасцы задушыш!..

Прыёмная напаўняецца людзьмі: з кабінета выскачыла сакратарка, пляснуўшы ад неспадзеўкі рукамі; з калідора ўвайшлі і спыніліся ў зняменні — прафесар, Марфачка і Юра з валейболам пад пахай.

— Палена мне дайце! Мятлу!.. Мая Кірылаўна!..

Сакратарка памкнулася, каб кінуцца на дапамогу дырэктару, і нязграбным рухам скінула акуляры, Хадаркевіч знячэўку раструшчыў іх нагою.

— Мае акуляры! Я нічога не бачу — ускрыкнула Мая Кірылаўна, але гэта быў ускрык дзіцяці, якое толькі што нарадзілася на свет. Аказваецца, усё куды прасцей і цікавей, калі глянуць на людзей сваімі вачыма. Дзівосная ўсмешка бліснула ў вачах сакратаркі. І мы ўбачылі, які ў яе прыгожы і вясёлы твар.

Тым часам няўлоўны драпежнік з-пад столі, з лямпавага каўпака стрымгалоў кідаецца наніз і ўжо хапае Дарафея Панцялеевіча за лыткі. Дырэктар пачынае адбіваць нагамі, і, не ўтрымаўшы роўнавагі, валіцца дадолу. Марфачка падбягае да яго і спагадна асцепае ад пылу.

— А, гэта ты? — крычыць у лютасці дырэктар. — Вы з дзедам знарок яго сюды прынеслі і выпусцілі! Вон!.. Юры Самсонавіч! Біце мячом у правы кут! Ён там. О-о, чуеце?

Прысутныя, узброіўшыся, хто чым змог, таксама прабуюць далучыць свае сілы, хоць ніхто яшчэ і не цяміць — каго тут б'юць.

Дарафей Панцялеевіч першым кідаецца ў кут, хапае мяч і з неспадзяванага перапуду запаўзае пад стол, а потым, падбегшы да шафы, хаваецца туды. Неўзабаве адтуль чуецца жахлівы енк.

— Што такое?

— Хто яго ўкусіў?

— Хто?

— Чмель! — спаважна адказвае Хадаркевіч. — У кожнага ў душы — свой чмель. Прыслухайцеся. Гудзе? Няхай гудзе! Не забівайце яго, не знішчайце! Кусае ён насмерць, напавал!

Страшны лямант вырываецца з шафы. Адчыніўшы дзверцы, Дарафей Панцялеевіч выходзіць адтуль з валейболам у руках, ужо зусім зняможаны, без пробліску надзеі на жыццё. Апошнім намаганнем ён прыціскае мяч да грудзей, як штосьці роднае яму і дарагое — той не вытрымлівае і робіць свой перадсмяротны ўздых.

— Усё. Мяне ўкусіў чмель. Канец.

Сяброўскія сувязі

У мінулым годзе дацэнт Гомельскага педінстытута Л. Цімашкова ў складзе турысцкай групы наведала Югаславію. Там яна завязала цесную дружбу з навуковымі работнікамі многіх навучальных устаноў.

Пасля прыезду з Югаславіі Цімашкова пачала атрымліваць шматлікія пісьмы, кнігі. Так, свае кнігі ёй прыслалі навуковыя работнікі Македонскага універсітэта Рада Угрынава, Барыс Маркаў, студэнт Белградскага універсітэта Мілан Рыстановіч і іншыя. Барыс Маркаў прыслаў свой пераклад «Героя нашага часу» М. Лермантава і часопіс са сваімі артыкуламі. У пісьме ён паведамляў, што універсітэт можа прыслаць свае выданні, а таксама граматыку македонскай мовы і мастацкую літаратуру.

З таго часу і пачалася перапіска з югаслаўскімі сябрамі. Выкладчыкі і студэнты педінстытута ўжо маюць дзесяткі розных кніг на мовах народаў Югаславіі. У літаратурным кабінеце інстытута стварэцца асобны кніжны фонд югаслаўскай літаратуры.

Нядаўна крытык-літаратуразнаўца Харватыі Бран Месаровіч прыслаў зборнік сербска-харвацкай лірыкі, аўтарам якога з'яўляецца выдатнейшы югаслаўскі літаратуразнаўца Бажыдар Кавачэвіч. У апошні час ад Брана Месаровіча атрыманы яго пераклады твораў І. Крылова, А. Талстога.

У сваім апошнім пісьме на імя Цімашковай мовазнаўца Рада Угрынава сардэчна дзякуе за дасланы ёй двухтомнік В. Маякоўскага, за дапамогу ва ўстанаўленні сувязі з Акадэміяй навук БССР. Нядаўна дацэнт Цімашкова рыхтавала работу аб сучаснай паэзіі брацкіх народаў Югаславіі. Дапамогу ў перакладзе ёй аказала Рада Угрынава.

Югаслаўскія навуковыя работнікі і студэнты ўсё больш цікавяцца літаратурай, мастацтвам братніх народаў Совецкага Саюза, і дапамогу ў гэтым ім аказваюць гомельскія сябры. Так, дацэнт педінстытута П. Ахрыменка дапамог Радзе Угрынавай устанавіць сувязь з украінскім мовазнаўцам В. Ільіным і атрымаць яго падручнік «Прэфіксы ў сучаснай украінскай мове». Старшы выкладчык Ф. Цімошак накіраваў у адрас югаслаўскага мовазнаўцы-перакладчыка Барыса Маркава выбраныя творы Янкі Купалы і Кандрата Крапівы.

М. ПЯТРОЎ.

З замежнай пошты

Шэкспір і... містыка

Чырвоны пераплёт, шматлікія па-майстэрску выкананыя ілюстрацыі і чарцяжы. Вышла кніга ў Чыкаго. Размова ў ёй ідзе пра Шэкспіра.

Мы ведаем Шэкспіра як вялікага знаўцу чалавечай псіхалогіі, вялікага мастака-рэаліста. Але ўсё гэта ніколькі не цікавіць Петара Арнольда, аўтара кнігі «Экзатэрызм Шэкспіра». Ён усяляк імкнецца паказаць Шэкспіра «містыкам, чараўніком, магам». Цэлы раздзел даследавання, напрыклад, прысвечаны шэкспіраўскім ведзьмам і таямніцам іх прароцтва Макбету. Аўтар спрабуе давесці, што ў гэтых прароцтвах ёсць нейкі таямнічы, глыбокі сэнс. У пацверджанне ў кнігу ўклеены чарцяжы, разабрацца ў якіх, дарэчы, чалавеку, не знаёмаму з тайнамі магічных навук, не так ужо лёгка.

Шэкспір ва ўяўленні Петара Арнольда з'яўляецца, аказваецца, выдатным знаўцам... замагільнага свету. Героі Шэкспіра, якія жывуць у гэтым грэшным свеце, не цікавяць паважанага даследчыка. Затое кожны шэкспіраўскі «прывід» падвяргаецца стараннаму «вывучэнню», з якога нечакана выясняецца, што Шэкспір — найвялікшы пісьменнік, — папярэднік... «сучаснага спірытызму».

Гэтае знешне сур'ёзнае даследаванне можа паказацца трызненнем вар'ята. Сярод персанажаў бессмяротнай трагедыі «Гамлет» ёсць Розенкранц. На думку Петара Арнольда, Розенкранц — не то папярэднік, не то прадстаўнік містычнай масонскай плыні «Розенкрэйцараў» (дарэчы, узнікшай значна пазней, к канцу XVII стагоддзя). Сувязі аднаго з герояў шэкспіраўскай трагедыі Розенкранца з Розенкрэйцарамі прысвечана многа старонак гэтай кнігі. А Гамлет ва ўяўленні Петара Арнольда — ніхто іншы, як выхадзец з таго свету, і вось чаму прывід бацькі шукаў з ім «містычных зносін». А што такое «Рамео і Джульета»? Гэта зусім не гісторыя кахання юнака і дзяўчыны, а «экзатычнае ўвасабленне містычнай прыхільнасці».

Цікава, што ў вялікім даследаванні Петара Арнольда няма ні слова аб праўдзе шэкспіраўскіх вобразаў, а таксама пра гістарычную эпоху, паказаную ў геніяльных шэкспіраўскіх п'есах. Падобныя «даследаванні» сведчаць аб безвыходным тупіку сучаснага буржуазнага літаратуразнаўства.

І. БАРЫСАЎ.

Галоўны рэдактар Васіль ВІТКА.
Рэдакцыйная калегія: Заір АЗГУР, Дзмітрый АРЛОЎ, Уладзімір АЛОЎНІКАЎ, Алесь БАЧЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Ірына ЖДАНОВІЧ, Янка КАЗЕКА, Барыс ПЯРКОЎСКІ, Рыгор ШКРАБА.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: г. Мінск, вул. Захарава 19. Тэлефон 3-24-61.

АТ 09023 Друкарня імя Сталіна.